Міхась Чарняўскі

# Правадыр крылатых вершнікаў

Ян Кароль Хадкевіч

Мінск
«Тэхналогія»
1998

www.kamunikat.org

ББК 63.3 (4Бел) 4 4-21
УДК 947.6+929 Ян Кароль Хадкевіч

*нашы
славутыя
землякі*

Серыя акадэмічная. Заснаваная ў 1988 годзе

Галоўны рэдактар серыі Зьміцер Санько

На франтыспісе — партрэт Яна Кароля Хадкевіча паводле малюнка фламандскага мастака А. ван Дэйка.

Чарняўскі М.
Правадыр крылатых вершнікаў: Ян Кароль Хадкевіч.— Мн.: Тэхналогія, 1998. — 61 с., [9] арк. іл.;партрэт.— (Нашы славутыя землякі). ISBN 985-6234-17-4

У кнізе апавядаецца пра слаўны і драматычны жыццёвы шлях Яна Кароля Хадкевіча (1560-1621), які быў адным з найвыдатнейшых палкаводцаў, што нараджаліся на беларускай зямлі. Чвэрць стагоддзя шабляй жаўнера і булавой гетмана ён слугаваўся Бацькаўшчыне. Нават апошні дзень яго зямнога быцця прайшоў пад гарматную кананаду.

ББК 63.3(4Бел)4

ISBN 985-6234-17-4

© Міхась Чарняўскі. 1998
© Макетаванне. Мастацкае афармленне.
“Тэхналогія", 1998

www.kamunikat.org

# УСТУПНАЕ СЛОВА

Гадоў з дваццаць таму, знаходзячыся ў археалагічнай экспедыцыі, на самым ускрайку Гарадзеншчыны я сустрэў летувіскага пастуха, што выгульваў статак на памежнай лугавіне. Даведаўшыся, што цікаўлюся старажытнымі часамі, дзядзька з суседняга краю, звычайны калгаснік, выклаў мне сціслы курс даўняй гісторыі свайго народа, успомніўшы нават міфічнае паданне пра нібыта рымскае яго паходжанне. Як жа мне стала гаркотна, бо нашы вяскоўцы, ды што вяскоўцы — бальшыня так званай інтэлігенцыі знаходзіліся тады ў глыбокім гістарычным бяспамяцтве. За часы майго школьніцтва і студэнцтва гісторыю Беларусі як прадмет не выкладалі ўвогуле. А калі што і ўспаміналі, дык гэта як нашыя продкі, "прыгнечаныя літоўскімі феадаламі ды польскімі панамі", ледзь не з часоў палявання на маманта толькі і марылі, каб "уз'яднацца з вялікім усходнім братам".

Айчынная гісторыя ляжала некранутым аблогам, зарастала пустазеллем абэцэдарскай маны і фальшы. Больш за тое, на ёй корпаліся няпрошаныя суседзі, збіраючы ў свае засекі ўсё лепшае, слаўнейшае, яскравейшае. Але прыйшоў час працы па адраджэнні беларускай дзяржавы, час збаўлення ад манкурцтва, вяртання ў нашую памяць лёсавызначальных датаў і падзеяў, імёнаў слаўных продкаў — не толькі ратаяў і будаўнікоў, але і вялікіх вучоных, палітыкаў, военачальнікаў. І з прымглёнай далечы стагоддзяў пачынае праяснящца велічная постаць палкаводца Беларускай зямлі Яна Кароля Хадкевіча.

За ўсе шэсць дзесяцігоддзяў жыцця нашага героя не сціхалі войны на палях Эўропы. Нават самым зацішшам знаходзіўся куток на кантыненце, дзе замест голасу развагі чуліся баявыя воклічы, звінела зброя і лілася кроў. Не спакайней было і на нашых землях, а таксама ў блізкіх суседзяў.

Нарадзіўся будучы палкаводзец на самым пачатку Інфлянцкай (Полацкай) вайны (1558-1582 гады). Менш як праз дзесятак гадоў пасля перамогі над усходнім суседам успыхнулі на Украіне казацкія паўстанні. Закранулі яны і Беларусь. Саракагоддзе Хадкевіча супала з паходамі на Падунаўе, а галоўнае — з начаткам войнаў са Швецыяй за Прыбалтыку. Менавіта ў змаганні з шведскімі арміямі дасягнуў ён найбольшай славы. Затым вялікі гетман вымушаны быў паспытаць ваярскага шчасця ў Масковіі. Схіл ягонага жыцця прыпаў на час абвастрэння дачыненняў з Турэччынай, якія перараслі ў войны праз усё XVII стагоддзе. Апошняй сталася перамога над султанам пад Хацінам (1621 год).

У бальшыні публікацый па гісторыі Беларусі, што з'явіліся ў нашай краіне за апошняе дзесяцігоддзе, не кажучы пра ранейшыя часы, асоба Яна Кароля Хадкевіча абыходзілася ўвагай. Добрым выняткам ёсць толькі кніга Вітаўта Чаропкі "Уладары Вялікага княства", у якой гетману прысвечаны аб'ёмісты нарыс. Польскіх жа гісторыкаў Хадкевіч цікавіў даўно. Яшчэ ў 1805 годзе ў Варшаве пабачыла свет прысвечаная яму кніжка А.Нарушэвіча. У XX стагоддзі іх апублікавана ўжо тры — А.Слівінскага міжваенным часам, В.Вянцкоўскай-Міцнер (1959 г.), Л.Падгарадэцкага (1982 г.). Шмат месца палкаводцу аддаецца ў артыкулах і манаграфіях, прысвечаных Інфлянцкай, Маскоўскай і Хацінскай войнам.

Для напісання гэтай кніжкі выкарыстана пераважна польскамоўная літаратура, з якой аўтар меў магчымасць азнаёміцца ў часе стажавання ў Польшчы коштам Фундацыі падтрымкі навукі (каса імя Ю.Мяноўскага). Факты знаходжання Я.К.Хадкевіча ў Маскоўшчыне ўдакладняліся з публікацый і расейскіх гісторыкаў, у прыватнасці М.Карамзіна.

У падборы ілюстрацый дапамагаў Яўген Кулік, за што яму шчырая падзяка.

www.kamunikat.org

## НАРАДЖЭННЕ АРЛЯНЯЦІ

Часы малога Яна * Вайна з Маскоўшчынай * Люблінская вунія * Славуты радавод * На ніве культуры і на пабаявішчы * Першыя крокі... * Прыклад бацькі * Узгадаванне рыцарскага духу

З'явіўся на свет Ян Кароль Хадкевіч у 1560 годзе. Адбылося гэта хутчэй за ўсё у Заблудаве на Падляшшы, у двары ягонага бацькі Яна Гараніма Хадкевіча. Аднак, мабыць, немаўля не запомніла сценаў заблудаўскага палаца, бо праз год пасля нараджэння двор перабраўся ў Мыш пад Баранавічамі. Тут і прайшло, пад пільнай апекаю маці, ранняе дзяцінства Яна.

На высокім беразе рэчкі Мышанкі стаяў замак-палац, абваколены чатырохкутнікам рова. Сёння гэта ўтравелыя земляныя ўмацаванні, што ўражваюць сваёй магутнасцю, кавалкі старасвецкай цэглы ды кусты шыпшыны, а можа і здзічэлых ружаў, калісьці пасаджаных руплівасцю якой-небудзь Хадкевічанкі.

Напэўна, малы Ян, забаўляючыся ў вечныя хлапчукоўскія гульні — у вайну, уздзіраўся па стромкіх схілах замчышча, штурмаваў з аднагодкамі роў, перабіраўся праз плынь Мышанкі. А ў цемнаватых пакоях палаца яго вабіла старадаўняя зброя на сценах, гербавыя выявы, алейныя партрэты барадатых продкаўз пільнымі вачмі. У гэтых сценах і адбывалася першая адукацыя хлопца, знаёмства з слаўнай гісторыяй роду Хадкевічаў, роднага Краю, выхоўваліся шляхоцкі гонар і самапавага. Пра што ж мог даведацца Ян ад маці, бацькі, крэўных і выхавальнікаў?

Наша дзяржава — Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, або проста Літва, — тым часам была яшчэ цалкам незалежная. Пад Літвой у вузкім значэнні слова разумелася тады цэнтральная і заходняя Беларусь улучна з Віленшчынай. Руссю была Беларусь усходняя і Украіна. Жамойцяй называўся захад цяперашняй Летувы. У шматэтнічным і разнаверным гаспадарстве адбываліся складаныя працэсы самаўсведамлення насельніцтва, на што істотна ўплывала веравызнанне. Беларус-каталік лічыў сябе ліцьвінам, праваслаўны — пераважна руссю, русінам. Полацка-Віцебскі край ды Смаленшчына мелі найменне Белая Русь — Беларусь. Таму і тутэйшыя жыхары нярэдка называлі сябе беларусамі або, каб падкрэсліць і дзяржаўную прыналежнасць, ліцьвінамі-беларусамі. З часам усё больш пачаў распаўсюджвацца саманазоў беларусаў — ліцьвіны. Яшчэ і сёння

расейскія стараверы Браншчыны называюць мясцовых жыхароў ліцьвінамі. Ліцьвінамі лічылі сябе старэйшыя людзі на Меншчыне яшчэ ў пачатку XX стагоддзя.

Нарадзіўся Ян пры жыцці вялікага князя Жыгімонта Аўгуста — апошняга прадстаўніка калісьці слаўнай на ўсю Эўропу дынастыі Ягайлавічаў. Нарадзіўся ў цяжкі для краю час, калі распачыналася крывавая вайна з маскоўскім царом Іванам Жахлівым, калі на Беларусі яшчэ квітнела ідэя царкоўнай рэфармацыі, якая магла зрабіць аднаверным нашае грамадства, ліквідаваць духоўны разрыў паміж сялянска-гарадскім насельніцтвам і феадаламі, паміж у значнай ступені каталіцкім Панямоннем і праваслаўным Падняпроўем.

Яму было дзевяць гадоў, калі адбылася вызначальная ў гісторыі народаў Цэнтральнай Эўропы падзея — Люблінская вунія. У выніку яе з'явілася Рэч Паспалітая[1], новае палітычнае ўтварэнне, што аб'ядноўвала на канфедэратыўных асновах дзве дзяржавы — Вялікае Княства і Карону (Каралеўства Польшчу, да якой адыходзіла Украіна і Падляшша). Да дзіцячага вуха гэта даходзіла ад старэйшых — колькі з тым было звязана размоў, спрэчак, абурэнняў і спадзяванняў. У сталым узросце вунія зробіць яго адданым грамадзянінам не толькі роднай Беларусі, але і Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў.

Хадкевічы паходзілі з спрадвеку праслаўнага старажытнага баярскага роду. Яго заснавальнікам быў Ходка Юр'евіч, які ў пісьмовых крыніцах прыгадваецца пад 1431 годам. Паводле царкоўнаславянскага напісання імя павінна было б быць Фёдар. Але такое ўжо беларускае вымаўленне, што яно рознымі спосабамі мінае "Ф". Таму сына Юрыя звалі Ходка, Хводка ці нават Хведка. Дый пазней Хадкевічаў часам пісалі — Хадковічы, Хвадковічы або Хвядкевічы.

Сын родапачынальніка Іван Ходкавіч (Хадковіч) пакінуў у нашай гісторыі больш справаў — удзел на чале загону беларускага рыцарства ў вайне з крыжакамі, выкрыццё змовы супраць вялікакняскай улады. Заслугі былі адпаведна ацэненыя — Іван узняўся ажно да пасады кіеўскага ваяводы. Праўда, ваяводства скончылася трагічна — пры нападзе ў 1482 годзе на Кіеў крымскіх татараў ён разам з сям'ёю трапіў у палон, дзе і памёр. Вялікі князь Казімір выкупіў сям'ю Івана Хадковіча з татарскай няволі, а над лёсам яго адзінага сына Аляксандра заапекаваўся асабіста.

Прадзед Яна Караля Аляксандр Хадковіч (Хадкевіч) яшчэ больш умацаваў свой род. Ён стаў маршалкам гаспадарскім і атрымаў у валоданне шматлікія землі, быў на розных вышэйшых пасадах, сярод

---

[1] Пераклад лацінскага res publica (рэспубліка).

якіх — ваявода наваградскі. Ажаніўся ён таксама, па прыкладзе бацькі, з прадстаўніцай знатнага роду, ад якой меў трох сыноў і дзве дачкі. Усё гэта прыносіла прыбытак, узвышала годнасць, давала магчымасць яшчэ вышэй уздымацца па сацыяльнай лесвіцы і заняць месца ў коле буйных кіраўнічых феадалаў Вялікага Княства — сярод Паноў-Рады. Ён да тага ж вызначаўся моцным здароўем і памёр у Мафусаілавым узросце — на 92-м годзе жыцця.

Па смерці Аляксандра сыны падзялілі яго разлеглыя ўладанні, паклаўшы пачатак тром галінам роду — быхаўскай, бераставіцкай і супраслеўскай.

Выдатна праявіла сябе бераставіцкая галіна Хадкевічаў. Яе прадстаўнік Рыгор Гаранімавіч быў адным з наймагутнейшых магнатаў Беларусі. Гэта ён спрыяў прадаўжэнню справы Скарыны, збудаваўшы ў Заблудаве[2] каля Беластока друкарню, дзе працавалі нашы слынныя кнігавыдаўцы Іван Федаровіч (Фёдараў) і Пётра Мсціславец. Ён жа разам з Мікалаем Радзівілам у 1564 годзе разграміў на Буле маскоўскае войска. Але зорка бераставіцкіх Хадкевічаў, ярка асвятліўшы ладную дзялянку беларускай мінуўшчыны, і згасла на Рыгору. Абодва яго сыны памерлі ў маладосці, не пакінуўшы нашчадкаў.

Гаранім Хадкевіч, пачынальнік быхаўскага адгалінавання роду, быў дзедам Яна. Яго жыццё і дзейнасць (памёр у 1561 годзе) прыпалі на час пашырэння і росквіту ў Беларусі пратэстанцтва, пераважна кальвінізму. Эўропе, якая тым часам усё больш уцягвалася ў таварнаграшовыя дачыненні, запатрабавалася зрэфармаваная, простая і танная царква, якая б асвячала не сляпую феадальную наканаванасць паходжання, а асабісты поспех актыўнага і прадпрымальнага чалавека. У Беларусь таксама траплялі рэфарматарскія ідэі пратэстанцтва, прынесеныя пераважна мясцовымі навучэнцамі эўрапейскіх універсітэтаў. Аднак паколькі краіна не дацягвала ў гаспадарчым развіцці да Заходняй Эўропы, то тутэйшую рэфармацыю ўзначалілі не месцічы, а свецкія феадалы, што імкнуліся прысабечыць касцельныя ўладанні. Наш рэфармацыйны рух ачоліў вядомы палітык і магнат Мікалай Радзівіл Чорны. Перайшоў з праваслаўя ў кальвінізм і Гаранім Хадкевіч.

Аднолькавае веравызнанне не перашкаджала Гараніму весці з Радзівіламі жорсткую барацьбу за ўплыў у Вялікім Княстве. Спрэчкі зайшлі так далека, што сталі пагражаць палітычнаму становішчу ў дзяржаве. Хадкевічы, імкнучыся ў гэтай барацьбе абаперціся на караля і польскае (кароннае) магнацтва, былі за шчыльнейшае аб'яд-

[2] Цяпер у Беластоцкім ваяводстве (Рэспубліка Польшча).

www.kamunikat.org

нанне з Польшчай у процівагу Радзівілам — перакананым незалежнікам. Прыхільнасць Гараніма ішла яшчэ далей — на імператарскі германскі двор. Карл V ацаніў прагабсбургскую пазіцыю магната з далёкай Беларусі і надаў яму графскі тытул і новы герб "Грыф з мячом", які стаў дадаткам да ранейшага герба "Касцеша".

Гаранім меў шэсць дачок і адзінага сына Яна. Гэта ўжо быў будучы банька Яна Кароля.

Ян Гаранімавіч вучыўся ва ўніверсітэтах Караляўца[3] і Ляйпцыга, авалодваў вайсковым майстэрствам пры двары Карла V. Калі ж пачалася вайна з Іванам Жахлівым за землі колішняга Лівонскага ордэна — Лівонію (сёння — Латвія і Эстонія), вызначыўся як военачальнік і здольны дыпламат. Яму ўдалося схіліць нямецкіх феадалаў Латвіі і Эстоніі да ўваходу ў склад нашай дзяржавы з захаваннем самакіравання. За заслугі перад Айчынай Ян Гаранімавіч займаў важныя дзяржаўныя пасады, што давала права засядаць у Радзе Вялікага Княства. А ў 1566 годзе ён стаў адміністратарам Інфлянтаў (правабярэжнай Латвіі і паўднёвай Эстоніі), гэта значыць намеснікам вялікага князя на гэтых тэрыторыях. Сваё знаходжанне ў Прыбалтыцы Хадкевіч зноў выкарыстаў на карысць бацькаўшчыне і дамогся яшчэ большага прыяднання Інфлянтаў да Вялікага Княства Літоўскага. У выніку наша дзяржава зноў вяртала сабе выхад у Балтыйскае мора, адабраны ў пачатку XIII стагоддзя нямецкімі рыцарамі-мечаносцамі.

Ян Гаранімавіч, як і бальшыня Хадкевічаў, выступаў за збліжэнне з Польшчай. Аднак, калі выявіліся намеры польскага магнацтва прыдбаць Украіну і Падляшша і цалкам прывязаць да сябе Беларусь, ён разам з Радзівіламі ды іншымі беларускімі патрыётамі энергічна запратэставаў. Але ў 1569 годзе перад краінай паўстала альтэрнатыва — пайсці на шчыльнейшы палітычны хаўрус з Польшчай або быць цалкам захопленай крывавым усходнім царом.

Кальвініст па бацьку, Ян Гаранімавіч ужо ў сталым веку пакінуў пратэстанцтва, але не вярнуўся ў веру продкаў, а перайшоў, як і пераважная бальшыня беларускіх феадалаў, у панавальную веру — каталіцтва. Гэта быў звыклы на той час шлях: праваслаўны — кальвініст — каталік. Такім чынам,уБеларусі пратэстантызм не стаўся сродкам нацыянальнай кансалідацыі, як, напрыклад, у прыбалтыйскіх краінах, а фактычна траянскім канём для акаталічвання, а ў гістарычнай перспектыве і паланізацыі значнай часткі нашага народу, асабліва арыстакратыі.

---

[3] Каралявец — стары беларускі назоў Кёнігсберга

www.kamunikat.org

Палітычная і ваенная кар'ера Яна Гаранімавіча пад канец 70-х гадоў паблякла. Па смерці апошняга Ягайлавіча, выкарыстаўшы часовае паслабленне цэнтральнай улады, вялізнае маскоўскае войска ў 1577 годзе зламала супраціў нешматлікіх беларускіх сілаў і захапіла на нейкі час Прыбалтыку ажно да Дзвіны. На поўначы ж Эстоніі замацавалася Швецыя. Сталася нагода абвінаваціць Хадкевіча, што ён у выніку палітычных змаганняў на бацькаўшчыне, асабліва з Радзівіламі, дапусціў аслабленне пазіцыі Вільні на Ніжнім Падзвінні. Пакрыўджаны і маральна прыгнечаны колішні адміністратар Інфлянтаў адышоў ад грамадскага жыцця.

А тым часам падрастаў малы Ян Кароль.

У шляхоцкіх і асабліва магнацкіх сем'ях асноўны клопат пра выхаванне дзяцей клаўся на плечы маці. Бацька ж быў вечна заняты то войнамі, то палітыкай, то гаспадарчымі справамі. Тым больш не былі выключэннем Хадкевічы.

Пачатковай адукацыяй хлопца займаліся хатнія настаўнікі і выхавальнікі. Ян, як і яго старэйшыя браты Гаранім і Аляксандр, павінны быў змалку ведаць беларускую, на той час дзяржаўную, мову. Пасля смерці дзеда Гараніма, пры якім у палацы Хадкевічаў панавала беларушчына, пад уплывам Янавай маці-полькі ў сям'і часцей пачынала ўжывацца польская мова. Ёю Ян аваладаў таксама дасканала, пра што сведчыць перапіска з пазнейшых гадоў і асабліва лісты да жонкі. Беларускую ж ён памятаў да скону, любіў у свае прамовы ўстаўляць трапныя выслоўі з роднай мовы.

Памяць продкаў, знаёмства з багатай беларускай гісторыяй, уплыў бацькі і асабліва стрыечнага дзеда Рыгора выхавалі ў хлопца глыбокую любоў да Радзімы.

Жыццё Яна Кароля Хадкевіча прайшлоў няпросты час, калі Вялікае Княства адстойвала сваю незалежнасць, супраціўляючыся спробам польскага магнацтва падпарадкаваць сабе нашу дзяржаву. Таму ў Яна Кароля найперш выхоўваўся ліцьвінскі (беларускі) патрыятызм. Ён акрэслена і недвухсэнсоўна адмяжоўваў сябе ад палякаў, лічачы магнатаў Кароны нядобразычліўцамі Вялікага Княства, якія толькі і імкнуцца, каб аслабіць нутраное адзінства ягонага краю. Аднак існаванне Рэчы Паспалітай давала беларускаму грамадству і некаторыя спадзяванні на лепшую будучыню, на абарону ўсходніх рубяжоў краю, адкуль часта і густа патыхаў сіберны вецер "маскаль" і прыходзілі варожыя войскі. Паступова пачынаў фармавацца акрамя "ліцьвінскага" і агульнадзяржаўны "рэчпаспалітны" патрыятызм, як гэта затым яскрава праявілася ў Касцюшкі або Адама Міцкевіча.

www.kamunikat.org

Хатняе навучанне Яна Кароля ўлучала чытанне і пісанне, арытметыку, гісторыю, верхавую язду, валоданне шабляй і рапірай, стральбу з лука і ручной агняпальнай зброі. Шмат часу аддавалася малітвам, удзелу ў касцельных набажэнствах. Пра апошняе асабліва рупіўся выхавальнік езуіт.

З ранняга дзяцінства ўжо праявіліся галоўныя рысы характару Яна Кароля Хадкевіча, яго здольнасці і памкненні, якія затым дазволілі яму стаць выдатнай гістарычнай асобай, а часам і шкодзілі ў жыцці. Ён з маленства вылучаўся вострым розумам, імкненнем да ведаў, замілаваннем да вайсковай справы, упартасцю і самаадданасцю ў дасягненні пастаўленых мэтаў. Неўтаймаваная натура часам прарывалася выбухамі шалёнага гневу, а высокая шляхоцкая годнасць перарастала ў магнацкую пыху.

www.kamunikat.org

## АРОЛ РАСПРОСТВАЕ КРЫЛЫ

Віленскія навукі * У эўрапейскіх універсітэтах * На пасадзе — новы манарх * Вяртанне на радзіму Жаніцьба * Змаганне з казакамі Налівайкі * Паходы ў Падунаўе

У 1573 годзе Ян і яго брат Аляксандр выпраўляюцца вучыцца ў Вільню ў езуіцкі калегіум. Сталічная Вільня, улюбёная колішнімі Ягайлавічамі, была шматлюднай і разбудаванай. За гарадскімі вежамі і сценамі мясціліся касцёлы і цэрквы, палацы магнатаў і мураванкі купцоў і заможных рамеснікаў. У прадмесцях да схілаў узгоркаў ляпіліся драўляныя дамкі бяднейшых жыхароў. А над усім велічна ўзвышаўся замак Гедзіміна.

Вільня была палітычным, гаспадарчым і культурным асяродкам Беларусі. Таму менавіта тут аселі ў 1570 годзе манахі ордэна езуітаў, што ставілі сваёй мэтай барацьбу з рэфармацыяй у імя аднаўлення непадзельнага панавання артадаксальнага каталіцызму. Важнае значэнне ў пашырэнні сваіх ідэяў яны надавалі навучанню дзяцей і моладзі, асабліва з сем'яў магнатаў і буйной шляхты, слушна мяркуючы, што "чыя ўлада — таго і вера". Таму адразу ж па з'яўленні ў горадзе манахі адчынілі Калегіум, які праз 8 гадоў вялікі князь і кароль Сцяпан Батура ператварыў у Акадэмію.

Віленская вышэйшая школа, забяспечаная здольнымі выкладчыкамі, адзіная такога роўню ў краіне, карысталася папулярнасцю. Сюды ахвотна аддавалі сваіх дзяцей не толькі каталікі, але й пратэстанты і нават праваслаўныя.

Юнак Хадкевіч старанна вывучаў у Калегіуме лацінскую мову, з якой магчыма было даць сабе рады ў кожным каталіцкім краі Эўропы. Атрымаў ён тут таксама веды па матэматыцы, красамоўстве, логіцы, гісторыі Грэцыі і Рыма, а таксама па геаграфіі. Езуітам абыходзіла найперш выхаваць не свядомых грамадзян дзяржавы, а паслядоўных прыхільнікаў касцёла. Таму вучняў не вучылі ні беларушчыне, ні польшчыне, нават цалкам міналася мясцовая гісторыя і заканадаўства Вялікага Княства. З артыкуламі Статута Вялікага Княства Літоўскага ў будучым самастойным жыцці выпускнікі Калегіума (і Акадэміі таксама) павінны былі знаёміцца самастойна.

Захавалася мала сведчанняў пра юнацкія, асабліва віленскія, гады Яна Хадкевіча. Некаторыя падрабязнасці маглі ўзнікнуць пазней у выніку звычайнай вакол людзей такога маштабу міфатворчасці. Таму даследнікі і сёння сумняваюцца, ці сапраўды малады Хадкевіч вітаў у

www.kamunikat.org

1579 годзе на цудоўнай лаціне Сцяпана Батуру, які па шляху на вайну з Масквой затрымаўся ў сталіцы. Кароль, выслухаўшы рослага юнака, быццам бы прадказаў яму бліскучую будучыню палкаводца. Але і сапраўды Ян змалку захапляўся вайсковай справай. Спачатку гэта былі дзіцячыя забавы, затым сур'ёзнае авалоданне ратным майстэрствам праз вопыт старэйшых, кніжкі колішніх знакамітых ваяроў. Затым прыйдзе час развіваць і адшліфоўваць вайсковыя веды на практыцы, дзе так бліскуча ў шматлікіх бітвах раскрыўся ягоны талент палкаводца.

Для дзяцей заможнейшых беларускіх сем'яў было абавязковым пасля першапачатковага навучання ў краі зрабіць вандроўку па Заходняй Эўропе, пабываць у тамтэйшых універсітэтах. Па заканчэнні Акадэміі, ужо пасля смерці бацькі, Ян і Аляксандр (найстарэйшы Гаранім на той час не жыў) таксама накіраваліся ў замежжа. Найдаўжэй браты затрымаліся ў Баварыі ў вядомым езуіцкім універсітэце Інгальштадта. Затым мы бачым іх у Італіі — у Падуі, дзе калісьці вучыўся Скарына, і ў Венецыі. Ян трапіў нават на Мальту, дзе мог шмат чаму навучыцца ў мясцовых ваяроў, што ўжо некалькі дзесяцігоддзяў супрацьстаялі войскам магутнай Асманскай імперыі[4].

За час адсутнасці маладых Хадкевічаў на бацькаўшчыне шмат чаго змянілася. Найперш — памёр славуты Сцяпан Батура. Пайшоў нечакана, рыхтуючыся да чарговага паходу на ўсход, гэтым разам адваёўваць Смаленск. Ім было зроблена шмат: праведзена вайсковая рэформа і разгромлена моц Івана Жахлівага, што больш як на паўстагоддзя змяніла баланс сілаў на беларуска-маскоўскай мяжы на нашу карысць. Значныя набыткі былі і ў Прыбалтыцы. І хоць Швецыі ўдалося адхапіць сабе поўнач Эстоніі, бальшыня земляў колішняга Лівонскага ордэна — Інфлянты падначаліліся Рэчы Паспалітай.

Аднак пасля смерці бяздзетнага Батуры зноў паўстала пытанне: хто зойме вялікакняскі і каралеўскі пасады? Распачалося вострае спаборніцтва паміж прыхільнікамі імператарскага роду Габсбургаў і шведскага каралевіча Жыгімонта Вазы, які па маці паходзіў з Ягайлавічаў. Невядома, як бы склалася наша далейшая гісторыя пры Габсбургах (пэўна б, узмацнілася германізацыя, асабліва польскіх земляў). Выбар жа заморскага кандыдата ў будучым кіне краіну ў пекла спусташальных войнаў са Швецыяй, украінскім казацтвам, Маскоўшчынай, Турэччынай.

www.kamunikat.org

---

[4] Афіцыйны назоў Турэччыны ад канца XIII стагоддзя да 1922 года, паходзіць ад імя заснавальніка дзяржавы Асмана I.

Выхаваны пры шведскім каралеўскім двары, Жыгімонт ніколі не пакідаў намеру вярнуцца ў Стакгольм на бацькаў пасад. У гэтым сэнсе на Рэч Паспалітую ён глядзеў як на сілу, якая магла дапамагчы яму здзейсніць такі намер. Заняты каталік, ён у процівагу сваім папярэднікам Ягайлавічам, ды нават і таму ж Батуру, быў нецярпімы да іншаверцаў. Гэта небяспечна абвастрыла сітуацыю ў шматканфесійнай дзяржаве, пасеяла нязгоду з пратэстантамі, якія займалі прыкметнае становішча ў палітычным жыцці Рэчы Паспалітай, са шматлікім праваслаўным насельніцтвам, асабліва на Украіне.

Час быў і Яну Хадкевічу, які ў 1590 годзе вярнуўся ў Беларусь, далучыцца да актыўнага жыцця ў краі. Але адбылося гэта не адразу. Малады Хадкевіч доўга адсутнічаў, быў нежанаты, на ім нібы ляжала пляма бацькавых няўдач у Прыбалтыцы. Усё гэта замінала добраму старту.

Найперш трэба было ўладкаваць сямейныя справы. Адбылася дзяльба бацькавай спадчыны з братам Аляксандрам. Яну дасталіся землі з Быхавам, Ляхавічамі, Свіслачам і Гнезнам на Ваўкавышчыне, значныя ўладанні ў Жамойці.

Цяпер можна было падумаць і пра сваё гняздо. Трыццацідвухгадовы кавалер прапанаваў руку і сэрца знатнай і багатай маладзіцы Соф'і — удаве князя Сымона Алелькавіча Слуцкага. Соф'я на доўгія гады стала каханай, шчырай і клапатлівай жонкай, якая як магла дапамагала мужу, падмяняла яго ў гаспадарчых справах пры частых і доўгіх адлучках, нярэдка дзяліла з сваім Янам нягоды вайсковага жыцця. Хадкевіч аддзячваў узаемнасцю. "Наймілейшая Зосечка, адзіная, каханая душа..." — звяртаўся ён да яе ў шматлікіх лістах.

Соф'я прынесла з сабой і пасаг — Цімкавічы і навакольныя землі на Капыльшчыне. Мястэчка стала ўлюбёнай мясцінай для Яна Хадкевіча, дзе ён стараўся праводзіць вольны ад вайсковых клопатаў час.

Неўзабаве сталася нагода маладому арлу паспрабаваць свае крылы на полі бітвы. Праўда, праціўнік быў не чужаземны, а свой, "паспольскі".

У 1594 годзе на Украіне бяднейшае казацтва, сярод якога было шматуцёклых ад панскага прыгнёту беларускіх сялян, падняло паўстанне. Узначаліў яго Севярын Налівайка. Паўстанцы пад націскам каралеўскіх сілаў і верных Рэчы Паспалітай казакоў адышлі на беларускае Падняпроўе. Тут, абапіраючыся на падтрымку прыгоннага сялянства і гарадской беднаты, яны атрымалі пэўныя поспехі, захапілі Магілеў і шэраг іншых гарадоў. Беларуска-украінскае магнацтва і шляхта дружна сталі на абарону сваіх уладанняў. Да іх далучыўся і Ян Хадкевіч, тым больш што паўстанне ахапіла таксама землі, што

www.kamunikat.org

належалі ўкраінскім князям Вішнявецкім, з якімі ён быў спароднены праз стрыечнага брата і сястру. Кіруючы ротай вершнікаў (каля 100 шабляў), малады Хадкевіч атрымаў першае баявое хрышчэнне ў баях з выпрабаванымі ваякамі — казакамі. Свае здольнасці і адвагу ён праявіў і пры ўзяцці Канева і пры аблозе табару Налівайкі пад Лубнамі. Мабыць, ва ўзнагароду за ўдзел у задушэнні казацкага паўстання Ян Хадкевіч атрымаў пасаду падчашага Вялікага Княства, а ў 1599 годзе ён быў прызначаны і старастам Жамойці, што раўнялася пасадзе ваяводы і давала месца ў найвышэйшым кіраўнічым органе Рэчы Паспалітай — Сенаце.

У 1599 годзе Хадкевіч з уласным загонам вершнікаў накіраваўся ў Сяміграддзе[5]. Праз год з братам Аляксандрам ён зноў апынуўся на поўдні, на гэты раз у Малдавіі і Валахіі[6]. Гэта былі землі, дзе сутыкаліся інтарэсы Аўстрыі, Турэччыны і польска-ўкраінскіх феадалаў. Сюды, на гора мясцоваму жыхарству, ішлі іх войскі, каб падтрымаць чарговага прыхільнага сабе князя. Як сведчаць сучаснікі, Хадкевіч у паходзе вы значыўся вялікай мужнасцю і адвагай. Праўда, поспех быў часовы, бо неўзабаве туркі выгналі стаўленіка Рэчы Паспалітай. Аднак Яну Каролю быў пажытак нетолькі ў тым, што гартаваўся ваярскі вопыт. За кампанію ў Валахіі ён стаў палявым (польным) гетманам — кіраўніком войска і атрымаў адпаведную булаву. Менавіта з гэтага часу ён стаў прафесійным вайскоўцам. Вайна зрабілася часткай ягонага жыцця, адпускаючы толькі ў рэдкія часы зацішша. Нават апошні яго зямны дзень прайшоў пад гарматную кананаду. Але гэта настане праз доўгія два дзесяцігоддзі. Цяпер жа беларускага ваяра клікала на свае палі Прыбалтыка, дзе ўжо чулася гарачае дыханне старадаўняга бога грому і вайны Пяруна.

[5] Сяміграддзе, або Трансільванія, — гістарычны абшар на паўночным захадзе сучаснай Румыніі.
[6] Валахія — гістарычная вобласць на поўдні сучаснай Румыніі, паміж Карпатамі і Дунаем.

www.kamunikat.org

## НА ІНФЛЯНЦКАЙ ВАЙНЕ

Пачатак ваенных дзеянняў * Супярэчкі з Радзвілам Пяруном * Палітычныя захады Яна Хадкевіча * Першыя перамогі * Хто такія гетманы? * Крылатыя вершнікі * Узбраенне і вайсковая тактыка

У 1594 годзе пасля смерці бацькі Жыгімонт Ваза стаў і шведскім каралём. Такім чынам узнікала персанальная вунія паміж Швецыяй і Рэчай Паспалітай, што магло рэальна аб'яднаць сілы дзвюх прыморскіх дзяржаваў у супрацьстаянні Маскоўшчыне, якая вельмі ж энергічна, асабліва ранейшымі гадамі Івана Жахлівага, "прасякала акно" ў Эўропу кірункам на Прыбалтыку. Аднак каталік Жыгімонт, абапіраючыся ўсё на тых жа езуітаў, актыўна пачаў фаварызаваць сваю веру і ў пратэстанцкай бацькавай вотчыне. Гэта выклікала супраціў амаль усяго мясцовага грамадства — феадалаў, месцічаў і сялянства. Малады Ваза быў адхілены ад улады, якая перайшла да яго дзядзькі пратэстанта Карла Судэрманскага.

Цяпер Жыгімонт Ваза мог вярнуцца ў Стакгольм толькі сілай зброі. Аднак ні магнацтва, ні шляхта Рэчы Паспалітай не хацела ваяваць з заморскай суседкай, справядліва мяркуючы, што спрэчкі за шведскую карону — сямейная справа роду Вазаў.

І тут Жыгімонт, якога Бог не абдзяліў хітрасцю, пайшоў на правакацыю. У 1600 годзе ён абвясціў перадачу ва ўладанне Рэчы Паспалітай Эстоніі, якая фактычна яму не належала, і загадаў нешматлікаму вялікакняскаму войску атакаваць шведаў у тамтэйшых гарадах. Тыя зараз жа перайшлі ў контрнаступ, адкінулі беларускія загоны і неўзабаве, маючы лепшую армію, прасунуліся да Дзвіны. Увосень войскі Карла Судэрманскага ўжо стаялі пад сценамі самой Рыгі.

Страта нядаўна набытых у Прыбалтыцы зямельных уладанняў вымусіла феадалаў Рэчы Паспалітай прыхінуцца на бок свайго караля. У студзені 1601 года яе парламент — Сой м абвясціў Швецы і вайну. Але, пакуль збіралася кароннае(польска-ўкраінскае) войска на далёкі паход, асноўны цяжар супраціву лёг на даволі сціплыя ўзброеныя сілы Вялікага Княства, кіраваныя вялікім літоўскім гетманам Крыштопам Радзівілам, празваным за свае перамогі Пяруном.

Вось у такой сітуацыі вясною 1601 года кароль і накіраваў Яна Хадкевіча ў Інфлянты як намесніка вялікага гетмана.

Цяжкое, не на карысць справе было супрацоўніцтва гэтых прадстаўнікоў двух сама ўплывовых у Беларусі, але пасвараных між сабою родаў. Да таго ж Пярун быў пратэстантам, а гэта не выклікала да яго

www.kamunikat.org

прыхільнасці і Жыгімонта. Хоць вялікі гетман і атрымаў шэраг перамогаў над шведамі, але нескаардынаванасць дзеянняў ягонага войска і сілаў Хадкевіча не дазволіла развіць поспех. "Радзівіл, ваявода віленскі, з панам Каролем Хадкевічам, старастам жамойцкім, на той час, як два каты" — трапна ахарактарызаваў сітуацыю адзін з удзельнікаў той вайны. З'яўленне ў Інфлянтах летам 1601 года каронных сілаў, да якіх далучыўся сам Жыгімонт Ваза, мала дапамагло справе. Тым больш што амбіцыйны Хадкевіч не хацеў падначальвацца і польскаму вялікаму гетману. Справа скончылася адыходам пры канцы года ў Польшчу бальшыні войска, якое не вытрымала зімовых нягодаў. Жыгімонт жа пакінуў Прыбалтыку яшчэ раней. А перад гэтым вярнуўся ў Беларусь састарэлы і хворы Радзівіл, дзе праз год і памёр.

Такім чынам, адзіным гаспадаром ваеннага лесу ў Інфлянтах застаўся Ян Кароль Хадкевіч, якому манарх даручыў кіраванне рэшткамі войска.

Цяжкасці перад Хадкевічам паўсталі, здавалася, непераадольныя — змалелае войска, на аплату якога да таго ж не ставала сродкаў; нізкая дысцыпліна жаўнераў, якія нярэдка па-сапраўднаму галадалі ды ішлі ў навакольныя паселішчы зброяй здабываць харчаванне або нават збягалі зусім. Нашым невялікім сілам у Прыбалтыцы супрацьстаяла здысцыплінаванае войска параўнальна багатай краіны, якая дынамічна развівала сваю гаспадарку — рамесную і мануфактурную вытворчасць, гандаль, земляробства, разбудоўвала флот. Аснову войска ўсё больш пачынала складаць набраная з маладых сялян пяхота з агняпальнай зброяй, якая выкарыстоўвала найноўшыя дасягненні эўрапейскай стратэгіі і тактыкі, а таксама найміты з розных эўрапейскіх краін.

Становішча ўскладнялася і сітуацыяй у самым краі. Мясцовая арыстакратыя была незадаволеная парушэннямі Вільняй і Варшавай аўтаноміі Інфлянтаў, раздачай земляў феадалам Беларусі і Польшчы, насаджэннем чужой адміністрацыі. Латышскія ж ды эстонскія сяляне і месцічы часта глядзелі на ваяроў Хадкевіча як на звычайных рабаўнікоў. Акрамя таго, жыхары паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі ўжо былі пераважна пратэстантамі, а іх пачалі спрабаваць вярнуць ва ўлонне каталіцкага касцёла. Асабліва шчыравалі ў гэтым езуіты. Усё гэта вяло да таго, што тутэйшыя гарады нярэдка адчынялі брамы перад шведамі, сустракаючы іх амаль як вызвольнікаў.

Ян Хадкевіч мусіў быць не толькі палкаводцам, але і арганізатарам і палітыкам. Найперш ён пачаў наводзіць суровую дысцыпліну ў войску, не спыняючыся нават перад караю смерцю. Аднак, вымагаю-

www.kamunikat.org

чы ад жаўнераў паслухмяпасці і прыкладнай вайсковай службы, заўсёды клапаціўся, каб яны былі накормленыя і апранутыя, мелі добрых коней і спраўную зброю. А дзеля таго, што з каралеўскай скарбніцы грошы паступалі рэдка і скупа, не шкадаваў і ўласных сродкаў.

Каб атрымаць прыхільнасць мясцовага насельніцтва, Хадкевіч строга забараняў сваім ваярам самавольствы, зніжаў падаткі, пацвярджаў даўнія прывілеі гарадам і даваў новыя. Не давяраючы палякам, ставіў на кіраўнічыя пасады ў краі сваіх суайчыннікаў.

У канцы 1602 года Ян Хадкевіч, прывёўшы з Вялікага Княства блізу дзвюх тысяч войска, распачаў актыўныя дзеянні. Маючы гусарскія і казацкія харугвы, а таксама пяхоту, вырушыў пад Дэрпт[7] у паўднёва-ўсходняй Эстоніі. Пачалася аблога шведскага гарнізона, у якой спадзяваліся больш не на штурмы і абстрэлы, а на звычайны голад, які з часам мог зламаць супраціў абаронцаў. Аднак праз месяц і ў самой аблозе засталася палова жаўнераў; астатнія, не атрымаўшы платы за службу, разышліся. Праўда, нават рэштай сілаў удалося не толькі заблакаваць горад, але і разбіць шведскі аддзел, што спяшаўся на падмогу. А затым здарыўся амаль цуд — выгаладнелыя пасля многіх месяцаў сядзення за гарадскімі мурамі шведы ў красавіку 1603 года сапраўды капітулявалі.

Аднак гэты поспех не натхніў войска на далейшы наступ, бо грошай па-ранейшаму амаль не было. У каралеўскіх адказах на роспачныя лісты Хадкевіча перасылаліся адны абяцанкі. Хіба што толькі крыху, і то зрэдку, харчаваннем і зброяй дапамагалі землякі. Пераважна з Беларусі ішло і папаўненне войска.

Каля года на працяг ваеннай актыўнасці не хапала сілаў. Неаплочанае войска бурчэла, утварала канфедэрацыі пратэсту, разыходзілася, і перадусім — іншаземныя найміты. Заставаліся найбольш вытрымлівыя, дысцыплінаваныя, верныя абавязку і самому Хадкевічу.

Улетку 1604 года Хадкевіч з войскам, папоўненым новымі харугвамі, аплочанымі пад заклад уласных маёнткаў у Летуве, ад Рыгі зноў вырушыў на поўнач. Трэба было спяшацца ўмацаваць залогу[8] Белага Каменя[9] — горада ў самым цэнтры Эстоніі. Пад тым Каменем на пачатку верасня Ян Кароль разграміў толькі што прысланы з-за мора шведскі корпус. Такі ж лёс затым напаткаў і іншую фармацыю праціўніка. Пасля апошняй бітвы палкаводзец паведамляў каралю:

---

[7] Цяпер Тарту.

[8] Залога — вайсковы аддзел, прызначаны для ўтрымлівання места або замка, гарнізон.

[9] Цяпер горад Пайдэ.

"25 верасня пачалася бітва. Лягло шведаў на пляцы больш як 3000, рэшта і шмат параненых у балотах згінулі; гарматак палявых 6, сцягоў 21 мне аддадзена, 5 рыцарствам параздзірана... Нашых забіта 81, параненых блізу 100". Пэўна, як такое звыкла здаралася ў падобных рэляцыях, страты працаўніка маглі быць завышаныя. Аднак перамога была несумненна значная.

Ды зноў жа адсутнасць сродкаў прыпыніла далейшыя дзеянні. А пры канцы года, калі надышлі асабліва халодныя і галодныя часы, некалькі гусарскіх харугваў адмовіліся падпарадкавацца военачальніку. Узбунтаваныя часціны, узначаленыя Аляксандрам Лісоўскім, пайшлі пад сцягі Змітра Самазванца паспытаць шчасця на маскоўскай зямлі. Раз'юшаны Хадкевіч запатрабаваў у канцлера Вялікага Княства Лева Сапегі суровага пакарання бунтаўніка. І, напэўна ж, не думаў, што шмат пазней давядзецца яму зноў сустрэцца з Лісоўскім на палях Маскоўшчыны.

Пры ўсім катастрафічным стане войска ў Інфлянтах дапамогі з Рэчы Паспалітай так і не было. Адзінае суцяшэнне — Сойм перадаў Хадкевічу булаву вялікага гетмана (1605 год), што засталася пасля нядаўна памерлага Крыштопа Радзівіла.

Што гэта за пасада была такая ў нашай дзяржаве — гетман?

У раннім Сярэднявеччы ў часе войнаў і бітваў войскам кіраваў сам князь або прызначаны ім ваявода — той, хто "вояў вядзе". Пры канцы XV стагоддзя пад уплывам польскай традыцыі ваяводаў усё часцей пачалі называць гетманамі[10]. Спачатку вялікі князь прызначаў гетмана часова — для арганізацыі абароны пэўнай часткі краю або кіравання вайсковымі аперацыямі на канкрэтным кірунку. Канчаткова пасада гетмана ў нашай дзяржаве была зацверджаная Аляксандрам Ягайлавічам на пераломе XV і XVI стагоддзяў пад час зацятых войнаў з Масквой. Пры гэтым напачатку існавала толькі пасада найвышэйшага (вялікага) гетмана, які, паводле сучасных уяўленняў, быў міністрам вайсковых справаў. Пазней пачаў прызначацца палявы гетман, які быў непасрэдным военачальнікам на пабаявішчы. Пры гэтым, як правіла, па сканчэнні вайны і "дэмабілізацыі" войска канчалася і гетманства. Пазней жа яно стала пажыццёвым.

Адным з першых беларускіх гетманаў быў Канстанцін Астрожскі, які пакрыў сябе несмяротнай славай на аршанскіх палях у 1514 годзе, калі яго войска пад бел-чырвона-белымі штандарамі разбіла амаль

---

[10] Гэтае слова было запазычанае ад чэхаў, а да тых трапіла з Нямеччыны: Hauptmann літаральна — галоўны чалавек, г.зн. начальнік.

утрая люднейшыя маскоўскія сілы. Былі сярод гетманаў Вялікага Княства славутыя асобы і з іншых магнацкіх родаў — Радзівілаў (сямёра), Сапегаў (шасцёра), Агінскіх (трое) ды інш.

Гетман як галоўны камандзір павінны быў вылучацца вопраткай і ўзбраеннем. У часы Яна Хадкевіча папулярны быў вугорска-гусарскі строй. Гетману яго шылі з найлепшых матэрыялаў і багата аздаблялі — жупан з нагрудным панцырам, шапка або шышак. Даўняя традыцыя вымагала ад военачальніка мець адкрыты твар, каб моцным голасам падаваць каманды і каб падначаленыя бачылі мужнае і поўнае рашучасці аблічча правадыра. А найлепш было ў часе бою не мець шалома і панцыра ўвогуле. Гэта падкрэслівала бясстрашнасць гетмана, яго пагардуда небяспекі і ўпэўненасць у перамозе. Абавязковай зброяй палкаводца была шабля ў багата аздобленай похве.

Найгалоўнейшы знак гетманскай улады — булава, на доўгім дзяржальне, разьбяная, упрыгожаная каштоўнымі металамі і камянямі. Кожная такая рэч была выдатным творам мастацтва. Булавой даваўся знак на пачатак бітвы, паказваўся кірунак атакі. У крытычны момант яна ўжывалася як зброя. Вядомы выпадак, як пад час маскоўскай кампаніі Ян Хадкевіч ударам булавы суцішыў шляхоцкую пыху аднаго з фаварытаў польскага каралевіча.

Каб войска бачыла, дзе знаходзіцца гетман, каля яго трымалі адпаведны знак. Ім было крыло арла або жураўля на доўгай жэрдцы з шарам, на які надзявалася гетманская шапка. Часам каля крыла прывязвалі бунчук з конскага хваста і бела-чырвоныя стужкі пад колер сцяга.

Пры палкаводцы быў і гетманскі сцяг з гербам. Тут жа знаходзіўся ахоўнік — шчытаносец. Аднак асноўнай аховай гетмана была прыбочная гвардыя з найлепшых ваяроў. У сама адказны момант, каб пераламаць ход бітвы, гвардыю кідалі і ў сечу.

Войска Рэчы Паспалітай было грунтоўна рэфармаванае Сцяпанам Батурам. Кароль паходзіў з Вугоршчыны, якая вяла частыя войны з Асманскай імперыяй. Прыходзілі на яго бацькаўшчыну і войскі з цэнтральнаэўрапейскіх краінаў, найболей з Аўстрыі. Такім чынам, вугорцы былі добра знаёмыя як з усходняй турэцкай, так і з эўрапейскай вайсковай справай.

Традыцыйна, яшчэ з ранняга Сярэднявечча, войска складалася пераважна з феадальнай конніцы. На шляхоцкай конніцы (паспалітым рушанні) грунтавалася збройная моц дзяржавы і пазнейшым часам. Гэтага вымагалі частыя войны з татарамі і масквой, якія мелі шмат дасканалых вершнікаў. Існавалі таксама і пяхотныя фармацыі, але яны найбольш ужываліся пры абароне або пры захопе чужых

www.kamunikat.org

гарадоў. Такое дамінаванне конніцы вяло да перамог "у чыстым полі", у кароткачасовых сечах. У зацяжных жа войнах, асабліва пры аблогах і штурмах умацаванняў, адчувалася нястача пяхоты. Так, можна ўспомніць перамогі яшчэ Альгерда і яго няўдачы пры спробе ўзяць Маскву, пазнейшыя цяжкасці пры аблогах Смаленска, Пскова. Дый вызваленне Полацка таму ж Батуру каштавала значных намаганняў.

Яшчэ апошні Ягайлавіч — Жыгімонт Аўгуст спрабаваў стварыць сталае платнае войска, так званае кварцянае[11]. Сцяпан Батура не толькі прадоўжыў справу папярэдніка, але і значна павялічыў колькасць войска, зрабіў яго больш сучасным. Аснову пяхоты пачалі складаць найманыя і выбранецкія фармацыі.

Выбранецкая пяхота набіралася з сялян каралеўскіх уладанняў. Наўзамен збройнай службы выбранцы вызваляліся ад усіх павіннасцяў, а найбольш храбрыя з іх, што асабліва вызначыліся ў бітвах, маглі нават спадзявацца на атрыманне шляхоцтва. Наймітамі маглі быць як народзінцы Беларусі, так і жыхары іншых краёў. Асабліва цаніліся ваяры з Нямеччыны і Вугоршчыны. Многія з іх былі сапраўднымі прафесіяналамі вайсковай справы, загартаванымі "выжламі вайны". Яны ішлі ў кожны куток Эўрогіы, дзе пахла порахам і спажывай.

Выбранцы і найміты былі ўзброеныя шаблямі, баявымі сякерамі і стрэльбамі — рушніцамі або мушкетам). Яны ўтваралі роты прыкладна па сто ваяроў, падзеленыя на дзесяткі. У часе бою пяхотнікі шыкаваліся ў шэрагі і ўтваралі прастакутнікі, прыкрытыя на перыметры пікінёрамі і шчытаносцамі. Такім чынам фармацыі ператвараліся ў рухомыя цытадэлі, ашчаціненыя доўгімі вострымі пікамі, абстаўленыя сцяной шчытоў. Варожай конніцы было нялёгка зламаць шыхты вопытных жаўнераў, тым больш калі тыя вялі густы агонь з рушніц і мушкетаў.

Кавалерыя дзялілася на два галоўныя віды — лёгкую і цяжкую. Да першай адносіліся вершнікі казацкага строю ("казакі"), якіх не трэба блытаць з казакам і запарожскімі, і так званыя ў Беларусі пяцігорцы. Лёгкія вершнікі ахоўвалі сваё цела кальчугай і мелі на ўзбраенні дзіды, шаблі, лукі і стрэльбы. Найлягчэйшымі лічыліся загоны беларускіх татараў, аселых у нас яшчэ пры Вітаўце, з шаблямі і лукамі.

[11] На яго ўтрыманне ішла чацвертая частка (кварта) прыбыткаў з каралеўскіх уладанняў.

Найгалоўнейшай часткай цяжкой кавалерыі з часоў Батуры сталі гусарскія фармацыі[12].

Характэрнай зброяй былі дзіды. Яны рабіліся з лёгкага дрэва і дасягалі 5-метровай даўжыні. Да іх жалезных вастрыёў мацаваліся сцяжкі. Прызначэнне гусарскіх дзідаў было спецыфічнае. Яны служылі для знішчэння шчыльных чатырохкутнікаў пяхотнікаў-пікінёраў або закаваных у жалеза турэцкіх вершнікаў. У атацы галопам дзіды крышыліся аб панцыры. Але справа зроблена — першыя шэрагі праціўніка парушаліся. Далей наставала чарга пісталетам, шаблям, рапірам, у валоданні якімі гусары былі непараўнаныя. Калі ж вопытная пяхота вытрымлівала першы ўдар, гусарскія шыхты з новымі дзідамі паўтаралі атаку. Часам шматкроць.

Тагачасныя і пазнейшыя малюнкі яскрава паказваюць сцэны гусарскіх атак: ураганныя хвалі вершнікаў з нізка прыгнутымі дзідамі, трапятанне мноства сцяжкоў. Уяўляецца навальнічны шум апераных крылаў, прымацаваных да рыцарскіх панцыраў, аглушальны тупат конскіх капытоў і рык тысяч мужчынскіх горлаў. Праз пыл і парахавы дым такая лавіна з жалеза і цягліцаў зносіла ўсё са свайго шляху. Менавіта такія атакі крылатых вершнікаў прыносілі найбольшую славу беларускай зброі і нашым палкаводцам.

Упершыню беларуская гусарыя найлепшым чынам засведчыла сябеў 1506 годзе ў пераможнай бітве Міхала Глінскага з татарамі пад Клецкам. Па-майстэрску выкарыстоўвалі яе Канстанцін Астрожскі пад Вішняўцом на Украіне ў бітве з татарамі (1512 год) і на аршанскіх палях — з масквой (1514 год), Мікалай Радзівіл Руды і Рыгор Хадкевіч на Вуле ў змаганні з масквой (1564 год), Сцяпан Батура ў часе паходаў на івана Жахлівага (1579, 1580, 1581 гады), Радзівіл Пярун пад Кокенгаўзэнам у Латвіі пад час бітвы са шведамі (1601 год). Гусарыя была ўлюбёным войскам і Яна Кароля Хадкевіча.

Яшчэ ў XIV стагоддзі ў Эўропе з'явілася першая агняпальная зброя, якая неўзабаве стала вядомая і ў Беларусі. Пад канец XVI ста-

---

[12] Гусары (ад вугорск. huszar) упершыню з'явіліся ў Вугоршчыне ў XV стагоддзі. Гусарскі баявы парадак у Цэнтральную Эўропу прынеслі сербскія вершнікі, якія пасля захопу іх бацькаўшчыны Турэччынай перабраліся ў суседнія краіны, што змагаліся з мусульманскай навалай. З'явіліся яны і ў Вялікім Княстве. Напачатку гусары былі лёгкай кавалерыяй, добра прыстасаванай да сечы з рухавым татарска-турэцкім праціўнікам. Пазней яны пачалі прыкрываць галаву і цела шышакамі і панцырамі-кірасамі, а ў бітвах карысталіся доўгімі дзідамі. шаблямі, канчарамі. Для паражэння праціўніка на адлегласці ўсё больш эфектыўнаю станавілася агняпальная зброя — пісталеты, хаця многія гусары заставаліся майстрамі лучнога бою, асабліва пры праследзе ўцекачоў.

www.kamunikat.org

годдзя яна значна ўдасканалілася, стала разнастайнай і эфектыўнай — стрэльбы некалькіх тыпаў, кароткарулевыя пісталеты, лёгкія і цяжкія гарматы. Хадкевіч, у прыватнасці, заўсёды вымагаў, каб ягоныя гусары мелі спраўныя пісталеты, якія пускаліся ў ход, калі была скрушаная дзіда, не было ўжо як замахнуцца шабляй ці трэба было імгненна дапамагчы таварышу, якому пагражала небяспека.

Якраз у гетманства Яна Хадкевіча конныя, асабліва гусарскія, войскі дасягнулі свайго зорнага часу. Але ўсё гусцейшыя і дакладнейшыя залпы артылерыі, мушкетаў і аркебузаў, беглая пальба пісталетаў былі тым громам, які абвяшчаў будучыя перамогі дысцыплінаванай і ўмелай пяхоты над вершнікамі. І ўжо ў сярэдзіне таго ж XVII стагоддзя кінжальны агонь шведскіх мушкецёраў не раз засцілаў пабаявішчы гусарскімі целамі.

Агняпальная зброя вымагала вялікіх сродкаў. Таму багацейшыя краіны мелі і лепшую пяхоту. Грошай жа ў Рэчы Паспалітай вечна не ставала. Часам нават бракавала коней-цяжкавозаў для артылерыі буйнога калібру.

У часы Яна Хадкевіча ўжо шырока выкарыстоўваліся розныя земляныя ўмацаванні, якімі абводзілася месца размяшчэння войска. Сам гетман неаднойчы дастасоўваў вопыт чэшскіх гуситаў і асабліва запарожскіх казакоў, абкружаючы лагер пасам счэпленых абозных вазоў. Такім чынам утвараўся табар, непераадольны для кавалерыі праціўніка.

www.kamunikat.org

## ПЕРАМОГА ПАД КІРХГОЛЬМАМ

Абвастрэнне сітуацыі * Аблога Рыгі Карлам IX * Хадкевіч спяшаецца на дапамогу * Выбар месца бітвы * Гераічныя чыны гусарыі * Разгром шведаў * Розгалас пра слаўную перамогу

Швецыя мела разоў у пяць меншае насельніцтва, чым Рэч Паспалітая, аднак апярэджвала яе ў гаспадарчым развіцці. Акрамя таго, там сфармавалася больш скансалідаванае грамадства, у якім прыкметную ролю адыгрываў не толькі кароль, але і парламент, дзе засядалі паслы як ад феадальнага стану,так і ад месцічаў, а таксама сялян, вольных ад прыгону. Таму прынятыя пастановы, пытанні вайны і міру ўспрымаліся не як прыхамаць валадароў, а як справа народа. Шведскія жаўнеры, што набіраліся пераважна з маладога вясковага люду, яшчэ саступалі нашым у вывучцы, але вылучаліся ўпартасцю земляроба, загартаванай суровай прыродай Скандынавіі. Разбітыя, здавалася б, ушчэнт, яны зноў збіраліся з сіламі і метадычна пачыналі вяртацьстрачанае.

Улетку 1605 года шпегі паведамілі, што Карл Судэрманскі, які да гэтага часу ўжо стаў каралём Карлам IX, зноў энергічна імкнецца да рэваншу ў Прыбалтыцы. Тры корпусы шведскага войска высадзіліся ў Інфлянтах і, займаючы па сваім шляху гарады і замкі, рухаліся да Рыгі. З падзеннем галоўнага горада Прыбалтыкі быўбы страчаны адзіны выхадз Падзвіння ў Заходнюю Эўропу. Зараз нават кароль Рэчы Паспалітай, вядомы сваёй скупасцю, адважыўся на большыя матэрыяльныя ахвяры і пераслаў Хадкевічу 100 тысяч залатовак на ўтрыманне войска. Сума была дастатковая, і палкаводзец таксама пачаў рыхтавацца да баявых дзеянняў.

Беларускае войска з-пад Дэрпта хуткім маршам пайшло на дапамогу Рызе. Па дарозе Хадкевіч паспрабаваў быў перахапіць корпус Ленартсана. Аднак вопытны шведскі военачальнік рухаўся лясамі і балотамі і ў сярэдзіне верасня злучыўся пад Рыгай з іншымі войскамі Карла IX. І шведскі кароль, маючы пад рукой 14 тысяч жаўнераў, пачаў аблогу горада.

Хадкевіч прыпыніўся на 8 дзён у Кесі[13], на паўночны ўсход ад Рыгі, збіраючы ў адзін кулак войска, гуртуючы яго да бітвы. Гетман не хаваў ад жаўнераў сур'ёзнасці сітуацыі — трэба было сустрэцца з утрая перасяжнымі сіламі праціўніка. Аднак іншага выйсця не было

[13] Цяпер Цэсіс.

— Рыгу мусілі ўтрымаць любымі сродкамі. Гарачыя намовы Яна Кароля дапаўняліся шматгадзіннымі малітвамі. Асабліва шчыра маліўся сам Хадкевіч як чалавек глыбокае веры.

Самым ранкам 25 верасня войска рушыла з Кесі да Дзвіны і ўжо вечарам наступнага дня пачало займаць пазіцыі на яе ўзбярэжжы каля вёскі Кірхгольм[14]. Да Рыгі заставалася паўтара дзесятка кіламетраў і, напэўна, ужо чуліся стрэлы асадных гарматаў. Такім чынам, нашае войска за два дні па бездаражы прайшло блізу 80 кіламетраў. А ў ім жа была не толькі конніца, а і пэўная лічба пяхоты, артылерыя, цяжкі абоз.

Карл IX своечасова даведаўся і пра падыход беларусаў, і пра іх мізэрную колькасць — да чатырох тысяч. Таму памкнуўся выправіць пад Кірхгольм толькі частку сваіх сілаў. Аднак вышэйшыя шведскія афіцэры, што ўжо паспыталі моц гусарскіх атак, настойвалі на ўсеагульным выступлений "Інакш, — тлумачылі, — хутчэй Дзвіна паверне назад, чым каралеўская міласць убачыць уцёкі ліцьвіноў".

Цёмнай хмарнай ноччу вырушылі шведы. Спяшаліся, каб на раніцу нечакана заспець змучаныя доўгім пераходам войскі Хадкевіча. І хоць імпэт збіў раптоўны праліўны дождж, на самым світанку 27 верасня яны ўжо набліжаліся да пагоркаў Кірхгольма.

Як толькі пярэдняя старожа прыкмеціла надыход праціўніка, Хадкевіч загадаў будзіць войска. Адбылі багаслужбу. Хутка паснедалі. Затым палкаводзец узняўся на пагорак, каб ацаніць шведскія пазіцыі.

Карл IX паставіў свае сілы ў чатыры лініі. Першую займалі шчыльныя шыхты шматтысячнай пяхоты, бальшыню якой складалі мушкецёры, падтрыманыя пікінёрамі. Другую лінію ўтварылі фінскія райтары[15] на левым крыле і шведскія — на правым. Пры гэтым аддзелы другой лініі стаялі насупраць прагалаў у першай, чым утваралася звыклая для тагачаснай эўрапейскай тактыкі шахоўніца (шахматная дошка). Трэцюю лінію зноў жа заняла пяхота, у тым ліку і частка каралеўскай гвардыі. На тыле пазіцый уладкаваліся рэшткі райтарыі. Іх задачай было не дапусціць спробы абкружэння, а таксама пры неабходнасці і самым зайсці ў фланг войска Хадкевіча.

Такім чынам, галоўную сілу шведскага войска складала пяхота, падмацаваная артылерыяй. Праўда, гэта яшчэ не была славутая пяхота наступных шведскіх каралёў — Густава Адольфа або Карла XII, а ў асноўным навабранцы. Былі, аднак, і дасканала вымуштраваныя

---

[14] Цяпер Саласпілс.

[15] Райтары (ад ням. Reiter — вершнік) — найманая цяжкая конніца ў Заходняй Эўропе XVI—XVII стагоддзяў.

www.kamunikat.org

фармацыі нямецкіх наймітаў. Кавалерыю ўтваралі райтары — вершнікі на цяжкіх конях, узброеныя пісталетамі і рапірамі.

Хадкевіч разумеў, што асноўнае спадзяванне Карла IX было на моц агняпальнай зброі, на чатырохкутнікі мушкецёраў, на пісталетную стральбу райтараў. Ім трэба было проціставіць імпэтную атаку конніцы з дзідамі і шаблямі. Тым больш у прапорцыі адзін супрацьтрох...

Беларускае войска ўшыкавалася трыма палкамі па тры лініі ў кожным. Цэнтр яго занялі 700 гусараў пад агульным камандаваннем Вінцэнта Войны. Тутнаперадзе было 300 гусараў самога Войны, у другой лініі — дзве харугвы Тодара Ляцкага, апошнюю лінію ўтваралі таксама дзве харугвы. Войну павінна была дапамагаць і пяхота з некалькімі гарматамі. Справа ад цэнтра размясціўся гусарскі полк Яна Петры Сапегі — блізу 650 вершнікаў. З іх прыкладна палова на чале з Аляксандрам Хадкевічам і Невяроўскім стала ў першую лінію. Пры боку, па некаторых звестках, знаходзілася і лёгкая конніца — пяцігорцы. Каля 200 гусараў самога Сапегі і Віляноўскага ўтваралі сярэднюю лінію. У тыле іх былі цяжкія вершнікі Змітра Барухоўскага і Марціна Гедройца.

Ударную групу сваіх сілаў Хадкевіч сканцэнтраваў на левым крыле. Яго склаў полк Тамаша Дубровы на 900 гусарскіх шабляў, дапоўнены загонамі лёгкай кавалерыі.

Тылы войска падтрымоўвалі вершнікі Яна Кішкі, Адама Тальвоша і Белазора, узброеная чэлядзь. У нашых баявых шыхтах знайшлося месца і інфлянцкай шляхце з аркебузамі і тром сотням райтараў герцага Курляндыі, якія пераправіліся праз Дзвіну перад самым пачаткам бітвы[16].

---

[16] Абсалютную бальшыню нашага войска ў інфлянцкай кампаніі складалі беларусы. Падаем сцісылыя звесткі пра найбольш вядомых военачальнікаў; Ян Петра Сапега — з магнацкага роду, які паходзіў ад полацкіх баяраў; Вінцэнт Война — з шляхоцкага роду Войнаў-Грычыновічаў, якія мелі маёнткі паміж Пінай і Прыпяццю; Ян Кішка — будучы полацкі ваявода і вялікі гетман, з магнацкага роду Кішкаў; Аляксандр Хадкевіч — брат Яна Кароля, уладальнік Мышы і шклоўскага графства; Зміцер Барухоўскі — з шляхоцкага роду, што валодаў маёнткамі на Берасцейшчыне і на захадзе Украіны; Тамаш Дуброва — з шляхоцкага роду, які займаў розныя службовыя пасады пераважна на Віцебшчыне; Марцін Гедройц — са шматлікага княскага і шляхоцкага роду, які паходзіў з Віленшчыны, ад 1617 года — амсціслаўскі ваявода; Шчасны Невяроўскі — з шляхоцкага роду з Падляшша; Тодар Ляцкі — з баярскага роду перабежнікаў з Маскоўшчыны, якому былі нададзеныя маёнткі ў Беларусі (першапачаткова Высокі Двор і Жалудок); Рудаміны — з шляхоцкага роду, што валодаў маёнткамі ў розных месцах Беларусі, у тым ліку на Наваградчыне, бралі чынны ўдзел у Інфлянцкай і Хацінскай войнах; Аляксандр Лісоўскі — з шляхоцкага роду, вядомага ў Беларусі ад сярэдзіны XVI стагоддзя; Мікалай Зяновіч — староста чачэрскі і прапойскі, са

Метраў за 200 ад пазіцыі палкаводзец паставіў табарам абоз, умацаваўшы яго пасам счэпленых вазоў. Перад абозам вызначылася месца чатыром татарскім харугвам. Беларускія татары-вершнікі асабліва прыдаваліся ў імклівым і нечаканым нападзе або ў пагоні, калі праціўнік уцякаў. Бою з цяжкаўзброенымі жаўнерамі, ды яшчэ пры агняпальнай зброі, татары звычайна не вытрымлівалі. Таму і пакінуў іх Хадкевіч у рэзерве, каб у выпадку цяжкой сітуацыі маглі захінуцца за вазы.

На цэнтральным кірунку шведы мелі велізарную перавагу сваёй пяхоты (блізу 5 тысяч) над некалькімі харугвамі Войны. Больш шматлікай каралеўская конніца была і на правым фланзе. Толькі на прырэчным краі Хадкевічу ўдалося стварыць колькасную перавагу. Такое было зроблена наўмысна. Тут гусары павінны былі праламаць шыхты праціўніка, збіць з поля райтараў і ўдарыць у бок пяхоце. Татары ж мусілі пераследваць уцекачоў. Надзвычай важная роля адводзілася і цэнтру. Ён павінны быў скаваць масы шведскай пяхоты да развязання тактычных задачаў на флангах.

Каб прытупіць пільнасць шведскага караля і вымусіць яго на неасцярожныя крокі, беларускі гетман сціснуў свае шыхты так званым гранітным парадкам. Зараз яны выглядалі яшчэ болей малалікімі, чым былі на самой справе.

Скончыўшы з ушыкаваннем войска, Хадкевіч звярнуўся да ваяроў з заклікам да мужнасці і самаахвяравання дзеля перамогі. Калі ж пачаў гаварыць аб шматлікасці праціўніка, адзін з гусараў заўважыў, што шведаў лягчэй будзе палічыць па трупах. Магнат не толькі сцярпеў, што яго перапынілі, але і ўсцешыўся з такога баявога настрою. І сапраўды, мала каго абыходзіла, што трэба біцца ў такой меншыні. У памяці быў вопыт нядаўніх перамогаў і амаль заўсёды над значна перасяжнымі сіламі. Менавіта з гэтай жа прычыны шведскія ваяры не асабліва рваліся да зброі.

---

старадаўняга шляхоцкага роду, што валодаў маёнткамі на Гарадзеншчыне, Меншчыне і Полаччыне; Людвік Гасеўскі — з шляхоцкага роду, які асеў у Беларусі з канца XVI стагоддзя (маёнткі на Ашмяншчыне, Смаленшчыне, Амсціслаўшчыне); Петра Стабро ўскі — з шляхоцкага роду, распаўсюджанага ў Беларусі, Мікалай Касакоўскі — першы чарнігаўскі кашталян, з шляхоцкага роду, што паходзіў з Мазовіі; Юры Францкевіч — з шляхоцкага роду, разгалінаванага па ўсёй Беларусі; Андрэй Млоцкі — аршанскі староста; Валовіч — са старадаўняга шляхоцкага роду, разгалінаванага па ўсёй Беларусі; Белазор — са шматлікага шляхоцкага роду, які валодаў маёнткамі на Полаччыне і Летуве; Гогаль — з шляхоцкага роду, што меў уладанні пераважна на беларускім Палессі; Мадалінскі — з шляхоцкага роду, які валодаў Крывічамі і Данюшавам.

www.kamunikat.org

Час ішоў, а бітва не пачыналася. Праціўнікі займалі выгадныя пазіцыі на пагорках, падзеленых лугавінай з ручаём. Распачаць актыўныя дзеянні значыла спусціцца ў нізіну і атакаваць пад гару. Да абеду абыходзіліся дробнымі сутычкамі храбрэйшых майстроў шаблі. Аднак потым, каб завабіць Карла IX, Ян Хадкевіч намерыўся ўжыць хітрасць. Папярэдзіўшы, каб не рабіць панікі, сваіх афіцэраў аб задуманым манеўры, ён загадаў загонам лёгкіх вершнікаў сімуляваць адступленне. Кароль, у якога таксама канчалася цярпенне, падумаў, што беларусы пакідаюць пабаявішча, і даў знак пачынаць наступ.

Хіспуўся лес пікаў над галовамі шведскіх ваяроў і непаваротлівыя сціжмы пяхоты рушылі да ручая, перайшлі яго і пачалі ўздымацца па схіле. Пяхоту падтрымала райтарыя. Калі праціўнік дастаткова наблізіўся, вялікакняская пяхота дала залп з гарматак і мушкетаў, а затым Хадкевіч загадаў Война пачаць атаку. Гусарскія роты адразу ўзялі ў галоп, і шведы паспелі зрабіць толькі адзін залп, як крылатыя вершнікі ўжо ўрэзаліся ў іх шыхты. Гусарскія дзіды скрыжаваліся з пікамі пікінёраў, шаблі сутыкаліся з рапірамі, густы дым ад пісталетных і мушкетных стрэлаў узвіўся над пабаявішчам. Каралеўская пяхота, асабліва найманыя немцы, вытрымалі віхуру гусарскай атакі. Ды перад вершнікамі Война і не стаяла задача знішчыць шматтысячную сілу праціўніка. Гэта было па-за іхнымі магчымасцямі. Галоўнае, што яны звязвалі манеўры пяхотных фармацый, не давалі ім разгарнуцца на ўсю моц. Гусары неслі значныя страты, быў паранены сам Война, але і шведы пакуль не думалі аб руху наперад. Іх турбавала, як хоць адбіцца ад гэтых апантаных "крылатых д'яблаў" са звярынымі скурамі на плячах, што паўтаралі і паўтаралі атакі.

Такім чынам, у цэнтры ўсё адбывалася па задуме гетмана. Аднак галоўныя падзеі ў першай фазе бітвы разыграліся на прыдзвінскім крыле. Тут гусары Дубровы, абышоўшы райтараў збоку, контратакай спынілі шведаў, а потым адкінулі іх на іхную ж пяхоту. Частка вершнікаў кінулася наўцёкі па рыжскім шляху. Наўздагон паімчалі татары і не было паратунку палахлівым. Дуброва з бліскам выканаў сваю задачу — гэтае крыло каралеўскага войска перастала існаваць.

На правым крыле райтарыя, складзеная з фінскіх вершнікаў, пераважала амаль удвая. Але гэта не спыніла гусараў Яна Сапегі. Атака галопам змяла пярэднія шыхты фінаў і тыя пачалі адступаць. Убачыўшы гэта, Карл IX паслаў на дапамогу ўвесь свой рэзерв. Свежыя райтарскія роты ўдарылі ў бок сапежынцам і тыя ў сваю чаргу апынуліся ў крытычным стане. І вось тут Хадкевіч заўважыў, што ў замарскага караля больш не засталося запасных сілаў. А ў гетмана яны яшчэ былі. І тады ў справу ўступілі харугвы Тодара

www.kamunikat.org

Ляцкага. Гусары неўпрыкмет абагнулі зарослыя вясковыя могілкі, зайшлі збоку і на поўным галопе ўрэзаліся ў аголены фланг каралеўскага рэзерву. Райтары не вытрымалі напору і сталі шукаць паратунку ва ўцёках. Такім чынам адкрыўся і напольны бок пяхоты, якая ўсё яшчэ была занятая змаганнем з вершнікамі Войны. Флангавага ўдару шведы і немцы не вытрымалі, шыхты паддаліся і рассыпаліся, кожны пачаў ратавацца паасобку. А гэта толькі і трэба было гетману. Бубны і трубы падалі сігнал усеагульнай пагоні. Хто толькі быў на кані, кінуўся за ўцекачамі. Частка шведскіх пяхотнікаў прабілася да Кірхгольма і паспрабавала замацавацца ў тутэйшай мураванай бажніцы, але і там была вынішчаная казакамі і гусарскімі слугамі-пахолкамі.

На 9 кіламетраў ад Юрхгольма пад Рыгу палі і дарогі былі высланыя трупамі шведскіх жаўнераў. Яшчэ пад час бітвы палёг ад рукі Дубровы князь Люнабургскі, знайшоў тут свой апошні час і абачлівы Ленартсан, загінулі або трапілі ў палон многія іншыя знатныя шведы і военачальнікі. Ледзь уратаваўся і сам паранены Карл IX. Пад ім быў забіты конь. Інфлянцкі шляхціч, што служыў у шведскім войску, аддаў каралю свайго каня і тут жа паў сам, пасечаны шаблямі.

Пад Кірхгольмам палегла бальшыня шведскай пяхоты, блізу паловы райтарыі. Недабіткі дамкнулі да караблёў у вусці Дзвіны і спехам паплылі за мора. Вечарам гэтага дня ва ўсіх Інфлянтах ужо не заставалася ніводнага шведскага жаўнера!

Трыумфатарам уступіў Ян Хадкевіч у Рыгу, маючы з сабой 60 трафейных сцягоў і 11 гарматаў. Як паведамляў ён затым Жыгімонту Вазу, уласныя страты былі каля 100 забітых і 200 параненых жаўнераў.

Кірхгольмская бітва — найбольш класічны прыклад пераможнага выкарыстання гусарыі. Дзякуючы дасканалай вывучцы, дысцыплінаванасці, а найбольш палкаводчаму генію Яна Кароля Хадкевіча яна прычынілася да поўнага знішчэння шматкроць перасяжных сілаў праціўніка.

Розгалас пра Кірхгольм шырока разляцеўся па тагачасным цывілізаваным свеце. Эўрапейскія манархі і папа рымскі слалі віншаванні Хадкевічу. Дзівіліся перамозе турэцкі султан і шах Персіі. Асаблівую ж радасць і энтузіязм геройскі чын вялікакняскага войска выклікаў на Бацькаўшчыне.

www.kamunikat.org

## МАРНАСЦЬ НАМАГАННЯЎ

*Змена арыентацыі каралерскага двара * Рокаш Зебжыдоўскага * Зноў у Інфлянтах — адваёва страчанага * Палітыянае становішча на ўсходзе Самазванцы * Пачатак адкрытай вайны * У Маскве * Замірэнне*

Імчаў, мяняючы коней, Ян Сапега з-пад Рыгі ў далёкі Кракаў. Вёз вестку пра слаўную вікторыю. Паспеў якраз на імшу ў вавэльскай катэдры, дзе і ўручыў каралю ліст Хадкевіча. Вялікае ўзрушэнне прайшло па краінах Рэчы Паспалітай. Думалася — нарэшце канец гэтай нямілай шведскай вайне. Жыгімонт у лісце ў адказ шчыра дзякаваў гетману, абяцаючы і ўшанаванні і сродкі для войска. Але, як часцей за ўсё здаралася перад гэтым, сродкаў якраз і не паступіла. У караля змяніліся планы. Шлях праз Інфлянты да бацькавай кароны пачаў здавацца яму занадта кружным. Выспела жаданне сягнуць па яе проста цераз мора. Да таго ж і на далёкай усходняй мяжы Рэчы Паспалітай засвяціліся новыя перспектывы.

Такім чынам, пад канец 1605 года клопат пра лес Інфлянтаў зноў цалкам лёг на плечы нашай краіны, а калі канкрэтней — на плечы ўсётаго ж вялікага гетмана. А ў яго зноў не было грошай на аплату войска, якое ўрэшце ўзбунтавалася зусім і рушыла ў Беларусь "карміцца" на каралеўскіх уладаннях. Частка ж, спакушаная вялікай здабычай, скіравалася на Падняпроўе да Змітра Самазванца. У замках Падзвіння засталося толькі некалькі сотняў сама дысцыплінаваных жаўнераў.

Ды на шчасце, Швецыя даволі доўгі час не магла акрыяць ад паразы пад Кірхгольмам. Таму зіма і наступны год прайшлі даволі спакойна.

Аднак так склалася, што Яну Хадкевічу цяпер давялося скрыжаваць шаблю не з заморскім праціўнікам, а з сваімі суграмадзянамі.

Палітыка Жыгімонта Вазы, якога многія ў Рэчы Паспалітай не ўспрымалі з самага пачатку, з гадамі выклікала ўсё большае непрыняцце. Абурала не толькі тое, што рукамі Вільні і Варшавы ён хацеў вярнуць сабе Швецыю, а і шмат іншага. Кароль па характары мала адпавядаў славянскай натуры. "Швед" быў маўклівы, халодны ў адносінах, да таго ж скупы. У вонкавай палітыцы ён усё больш схіляўся да хаўрусу з Габсбургамі, і ў прыватнасці з Аўстрыяй, а гэта пярэчыла традыцыйнай польскай ментальнасці. Акрамя таго, альянс з Венай пагражаў канфліктам з Турэччынай, уладанні якой непасрэдна прылягалі да паўднёвых ускраінаў дзяржавы. Фатальнай памылкай, якая

пазней дорага каштавала народам Цэнтральнай і Усходняй Эўропы, стала фактычная перадача Жыгімонтам прускіх земляў пад апеку Брандэнбурга, з якога пазней вырасла агрэсіўная дзяржава — імперыя германскіх кайзераў. У нутраной палітыцы каралю закідалася, што ён празмерна падтрымлівае езуітаў, падрывае рэлігійную згоду ў краіне, імкнецца да неабмежаванай улады. Канешне, сярод пачынанняў караля былі і слушныя, як вызначэнне рэгулярных падаткаў і ўмацаванне сталага войска. Але нават гэта яму не даравалася, тым больш што бальшыня магнацтва не хацела дапусціць змяншэння сваіх уплываў у абедзвюх дзяржавах Рэчы Паспалітай.

Яшчэ ў 1606 годзе шляхоцкія з'езды пачалі абгаворваць праекты адхілення Жыгімонта ад улады, а ў чэрвені наступнага года адмовілі яму ў паслушэнстве. Справа непасрэдна падышла да збройнага развязання канфлікту.

Антыкаралеўскае паўстанне — рокаш узначаліў кракаўскі ваявода Зебжыдоўскі, а ўплывовым кіраўніком сабранага шляхоцкага войска стаў вядомы беларускі магнат Януш Радзівіл. Кароль у сваю чаргу энергічна гуртаваў верныя сабе сілы. З Інфлянтаў паклікаў ён на дапамогу і Яна Хадкевіча.

Няслаўная гэта справа — ваяваць супраць сваіх, удзельнічаць у братазабойчай вайне. Таму невядома, на чыім баку пры іншых абставінах апынуўся б гетман. Ён шчыра прызнаваўся ў адным з лістоў да жонкі, што каралю "не верыў, не веру і верыць не буду". Аднак сярод ракашанаў быў зацяты праціўнік Хадкевічаў Радзівіл. Асабістыя антыпатыі пераважылі палітычны сэнс. І Ян Кароль, паспешліва падпісаўшы замірэнне са шведскім камандаваннем, 1 чэрвеня 1607 года на чале 600 вершнікаў быў ужо ў Варшаве, дзе тады знаходзіўся Жыгімонт. А 6 ліпеня пад Гузавам (на поўдзень ад Варшавы) дайшло да генеральнага паквітання з ракашанамі.

Бітва пачыналася вяла. Шмат хто з праціўнікаў быў між сабою добра знаёмы, спароднены, калісьці сябраваў. Таму наважыцца першаму ўзняць шаблю было нялёгка. Але ўрэшце дайшло да страляніны і сечы. Па некаторых звестках, менавіта Хадкевіч, перад якім стаялі сілы Януша Радзівіла, пачаў атаку. Паводле іншых — першым праліў кроў Януш. Доўгі час ні адзін з бакоў не меў перавагі. Вершнікі ракашанаў напачатку нават перамагалі. Але ўрэшце справу вырашыла рэгулярная пяхота і праціўнікі караля былі разбітыя. Радзівіл з беларускай шляхтай адступіў за Буг і Жыгімонт загадаў пераследваць іх. Але гетман адмовіўся. Тут развага яму не здрадзіла — поўны разгром Януша аслабляў бы пазіцыі Вялікага Княства перад Польшчай.

Праз пэўны час кароль, не маючы дастатковых сілаў на поўны разгром бунтаўнікоў, дараваў ім. Пры яго ж пасярэдніцтве адбылося замірэнне і ў Беларусі паміж Хадкевічамі і Радзівіламі, хоць супярэчнасці паміж гэтымі двума родамі засталіся. У перспектыве Гузаў стаў перамогай не караля, а менавіта магнацтва, якое яшчэ больш умацоўвала свае пазіцыі.

З цяжкім сэрцам увосень 1608 года Ян Хадкевіч вяртаўся ў Інфлянты. За яго доўгую адсутнасць сітуацыя тут шмат пагоршала, быццам і не было ранейшых перамогаў, быццам не пралілося столькі крыві і жаўнерскага поту. Шведы зноў, высадзіўшыся на безабаронным узбярэжжы Латвіі, пачалі пастунова прасоўвацца ўглыб мацерыка. Пачалося гэта увесну 1607 года. Тады былі занятыя біскупства Вендэнскае і Белы Камень. 27 ліпеня наступнага года Карл IX авалодаў Дыямантам[17] у вусці Дзвіны, 2 жніўня — Кокенгаўзэнам (Кукенойсам), 20 жніўня — Фелінам[18]. Такім чынам усе ранейшыя намаганні і Радзівіла Пяруна і асабліва Яна Хадкевіча пайшлі з ветрам. Шведскі пяхотнік зноў стаяў на беразе Дзвіны.

Хадкевіч не дачакаўся дапамогі караля, які ўжо цалкам захапіўся маскоўскімі планамі і амбіцыямі. Пры падтрымцы некаторых нашых магнатаў, трацячы на войска не толькі ўласныя грошы, але і жончыны, палкаводзец узяўся адваёўваць страчанае. Шведскай упартасці супрацьпаставілася беларуская, 12 тысячам Карлавых жаўнераў — 2 тысячы гетманскіх. Лютаўскімі снягамі і маразамі 1609 года нашае войска зрабіла марш пад Парнаву[19]. Штурм гарадскіх сценаў пад агнём сто чатырох шведскіх гарматаў скончыўся капітуляцыяй гарнізона. 4 сакавіка, пасля кароткага адпачынку, Хадкевіч кінуўся да Рыгі, абложанай праціўнікам. Але беларускае войска рухалася не толькі сушай. Даведаўшыся, што ў порце Саліс[20] спыніўся шведскі флот, гетман пасадзіў на трафейныя караблі, захопленыя ў Парнаве, і вялікія лодкі частку пяхоты і загадаў атакаваць ворага.

Спешаныя вершнікі, многія з якіх нават не бачылі зблізку мора, адважна рушыліся на бітву. Уначы, знянацку наблізіўшыся да шведаў у вусці ракі Салацы, яны накіравалі ў іхны бок некалькі падпаленых брандэраў[21], ад якіх загарэліся два вялікія варожыя караблі. Пры святле пажару па шведскай эскадры быў адкрыты моцны агонь з

---

[17] Сёння Даўгагрыва.

[18] Сёння Вільяндзі.

[19] Сёння Пярну.

[20] Сёння Салацгрыва.

[21] Брандэр (ад ням. Brand. — пажар) — судна, нагружанае выбуховымі і палкімі рэчывамі; выкарыстоўвалася даўней для падпальвання варожых караблёў.

гарматаў. Не вытрымаўшы імклівага націску нашых ваяроў, астатнія шведскія караблі мусілі шукаць ратунку ў адкрытым моры. Гэта была, бадай, першая ў беларускай ваеннай гісторыі марская бітва. І яе нашыя продкі бліскуча выйгралі.

Пад Рыгай Хадкевіч сустрэў гэтакае вялікае шведскае войска, што распачынаць генеральную бітву было самагубствам. Нават крылатыя вершнікі былі бяссільныя перад масаю добра вымуштраванай пяхоты, навербаванай з многіх краінаў Эўропы. Аднак беларускі драпежны воўк пры неабходнасці станавіўся хітрай лісіцай. Перад шведскімі пазіцыямі Хадкевіч крута павярнуў да Дзвіны і пачаў дэманстраваць баязлівае адступленне на левабярэжжа. У шведскага военачальніка Мансфэльда, што яшчэ пад Кірхгольмам кіраваў часткай войскаў Карла IX, мабыць, радасна выбухнула сэрца — вось час расплаты за колішнюю паразу! Ён загадаў хутка збудаваць мост,пераправіў цераз раку частку сілаў і, не чакаючы падыходу рэшты, кінуў іх на "баязлівых ліцьвіноў". А гетману толькі гэта было і трэба. "Уцекачы" імгненна павярнуліся, кароткай контратакай захапілі мост і высеклі "ў пень" усіх, хто трапіў пад шаблю. Зараз, калі шведаў істотна паменела, можна было зноў ісці да Рыгі. Аднак Мансфэльд не стаў трэцім разам выпрабоўваць лёс і паспешліва адступіў ад горада. Ды ўсё ж зноў давялося яму спаткацца з Хадкевічам больш як праз год. Непаводдаль той жа Рыгі гетман завабіў ягонае войска пад свой лагер, а затым атакаваў з засады з тылу і разбіў.

Шмат было планаў у Яна Кароля Хадкевіча. Слаў шпегаў у Эстонію, рыхтаваўся да наступу на землі, якія былі ва ўладанні заморскай кароны яшчэ ад Жыгімонта Аўгуста. Хацеў скінуць праціўніка ў Фінскую затоку і канчаткова ачысціць ад яго Прыбалтыку. Але зноў тая ж праблема: нястача грошай. У неаплочаным войску скончылася апошняе цярпенне — хто вярнуўся ў Беларусь, а хто (такіх было найбольш) накіраваўся ваяваць у Маскоўшчыну. Хадкевічу не было чаго больш рабіць у Інфлянтах. Пакінуўшы дробныя залогі ў гарадах і замках, ён таксама вярнуўся на Бацькаўшчыну, змучаны фінансавым клопатам, спакутаваны хваробаю нырак, ад якой часам быў на мяжы смерці. Увесь 1610 год магнат правёў у сваіх уладаннях у Беларусі і Летуве, парадкаваў гаспадарку, клапаціўся пра ўмацаванне Ляхавіцкага замка і будаўніцтва царквы для мясцовых жыхароў. Вярнуўся ж вялікі гетман у Прыбалтыку ў наступным годзе, каб падпісаць мір. Час на гэта прыспеў — памёр Карл IX, дый сама шведская дзяржава была звязаная распачатай вайной з Даніяй. Але не да міру было Хадкевічу.

www.kamunikat.org

Войны маскоўскага цара Івана Жахлівага супраць суседзяў, вынішчэнне псіхічна хворым валадаром усяго найлепшага ў сваім народзе давялі Масковію да катастрафічнага стану. Вялізная дзяржава, што прасцерлася ад Ледавітага акіяна да Каспія, курчылася ў сацыяльных і палітычных канвульсіях. Царскія пераемнікі і абяскроўленае дваранства не маглі ажывіць гаспадарства. Змовы, забойствы, пошасці і голад, агульны разлад і непарадкі ахапілі край. Запалалі паўстанні сялян і гараджан, падтрыманыя казакамі. Не прымусілі сябе доўга чакаць і суседзі. Паўднёвыя ўскраіны пачалі вынішчаць крымскія татары. Швецыя праявіла зацікаўленасць да Ноўгарадчыны. Але галоўная небяспека краю ішла ад беларускай мяжы.

Беларускія і часткова ўкраінскія феадалы наважыліся выкарыстаць аслабленне ўсходняга суседа для рэваншу, для вяртання земляў, захопленых Масквой яшчэ на пачатку XVI стагоддзя. Да гэтых інтарэсаў далучыліся польскія, і з'явілася задума як мага болей падпарадкаваць свайму ўплыву вялізнае ўсходняе гаспадарства. Такія памкненні актыўна падтрымала каталіцкая царква, якая намервалася ўзалежніць праваслаўе папу рымскаму, а ў перспектыве і скасаваць царквуўсходняга абраду. Ну а каралю Жыгімонту рупіў усё той жа клопат — не толькі аслабіць Маскву як шведскага хаўрусніка, але і з дапамогай яе сілаў зрабіць новы рывок за мора па бацькоўскі пасад. Як бачым, планы былі занадта маштабныя. Але цікава, штопры развažлівым падыходзе значная частка іх магла быць зрэалізаваная!

Для адкрытага ўмяшання ў справы на ўсходзе існавала фармальная перашкода — мір паміж Рэчай Паспалітай і Маскоўшчынай, падпісаны ў 1601 годзе. Таму спачатку былі выкарыстаны падстаўныя фігуры авантурыстаў, што выдавалі сябе за сына Івана Жахлівага і вакол якіх гуртаваўся ўвесь незадаволены расейскі люд, казацтва, а таксама розныя ахвотнікі прыгодаў і нажывы з Беларусі, Украіны і Польшчы. Аднак першы Зміцер Самазванец, які вырушыў па царскую карону ў 1604 годзе, пратрымаўся ў Крамлі меней за год. Другі ж, па адной з версіяў — шкаляр са Шклова, безнадзейна засеў пад Масквой у Тушынскім лагеры. Убачыўшы бясплённасць намаганняў самазванцаў, панавальныя колы Рэчы Паспалітай адважыліся на адкрытыя збройныя дзеянні. Увосень 1609 года Жыгімонт Ваза пачаў аблогу Смаленска, а праз год польска-беларускія войскі, у якіх многія з мясцовага баярства напачатку бачылі абаронцаў ад паўсталых сялян і казацтва, занялі без бою сталіцу.

Яшчэ напярэдадні выступу на Смаленск кароль прапанаваў Яну Хадкевічу, як найбольш дасведчанаму палкаводцу, узначаліць войскі. Але напачатку гетман адмовіўся. І на гэта былі прычыны. Ягоны ад'-

www.kamunikat.org

езд з Інфлянтаў на доўгі час значна аслабіў бы беларускія пазіцыі ў Прыбалтыцы, дзе было пражыта некалькі гадоў, праведзена столькі пераможных бітваў. Да таго ж існаваў і маёмасны інтарэс — у паўднёвай Эстоніі магнат меў вялікія зямельныя ўладанні. Да вайны ж на ўсходзе Хадкевіч, як і ягоная радня, ставіўся з вялікім сумневам. Ведаў, што ў далёкім і такім разлеглым краі для перамогі запатрабуюцца велізарныя сродкі, а менавіта іх у сама адказны час і не знойдзецца ў дзяржаўнай скарбніцы.

Адмова выклікала пагаршэнне дачыненняў з манархам. А тут яшчэ выявілася, што Жыгімонт можа пайсці на збліжэннез Янушам Радзівілам і даручыць яму кіраваць усходняй кампаніяй. Хадкевіч не мог дапусціць узвышэння свайго праціўніка і ўрэшце пагадзіўся з прапановай караля.

А сітуацыя на ўсходзе была няпростая. Неўзабаве ў маскоўскіх землях зразумелі, што з-за заходняй мяжы прыйшлі не вызвольнікі ад анархіі, а звычайныя захопнікі. Ужо вясною 1611 года ў сталіцу ўступіла разанскае апалчэнне, падтрыманае гараджанамі. Польска-беларускае войска былозмушанае адступіцьза сцены ўмацаванняў. Таму Хадкевіч спяшаўся. Маючы меней як 3 тысячы вершнікаў, у кастрычніку ён ужо быў у Маскве, перарываючы аблогу Крамля і ратуючы яго абаронцаў ад галоднай смерці. А зіма была вельмі халодная. Як пісаў адзін удзельнік паходу, "рукі нам да палашоў прымярзалі, мноства таварышаў і пахолкаў пальцы рук і ног і самі ногі паадмарожвалі". У такіх умовах трэба было не толькі трымаць абарону, але і рабіцьзбройныя выпады ў наваколле па харчы і фураж. Так пратрымаліся да вясны, спадзеючыся на гіадыход асноўнага войска з самым Жыгімонтам. Аднак той па сваёй завядзёнцы збіраўся вельмі паволі.Праўда, з-пад Смаленска, які быў нарэшце вызвалены ад маскоўскага панавання, прыйшла частка польскіх войскаў, але іх ганарысты начальнік не хацеў падпарадкоўвацца загадам "ліцьвіна". Абражаны, вялікі гетман адышоў у бок беларускай мяжы.

Даведаўшыся, што грозны Хадкевіч пакінуў Маскву, другое апалчэнне, на гэты раз з Ніжняга Ноўгарада, рушыла на сталіцу і пры канцы жніўня пачало штурм Крамля. Яну Каролю ў такой сітуацыі давялося зноў ісці на Маскву. Аднак у горадзе ён сустрэў шматлікага і моцнага праціўніка, гатовага змагацца насмерць.

Яшчэ 1 верасня, толькі з'явіўшыся ў Маскве, гетман паспрабаваў прабіцца да Крамля. Ды мусіў адступіць з вялікімі стратамі. Праз два дні беларускае войска зноў пайшло на прарыў аблогі. Бой быў надзвычай зацяты. Ішла бязлітасная сеча, у якой на вузкіх гарадскіх вуліцах, на руінах спаленай забудовы Хадкевіч не мог ужыць сваёй

галоўнай моцы — гусарыі. Некалькі гадзін узаемнага вынішчэння пераканалі гетмана ў безнадзейнасці спробаў мізэрнымі сіламі дамагчыся поспеху. Ды і залога Крамля не захацела дапамагчы беларусам вылазкай, каб не даваць Хадкевічу славы пераможца. Праз колькі дзён была яшчэ адна спроба пераламаць сітуацыю на карысць вялікакняскіх сілаў, але зноў беспаспяховая.

Нарэшце кароль з невялікім войскам — на большае не было сродкаў — дасягнуў Смаленска, а затым рушыў на злучэнне з Хадкевічам. Аднак ісці з такімі малымі сіламі на сталіцу не было сэнсу. Тым больш што гарнізон Крамля па дзевятнаццаці тыднях абароны капітуляваў. Жыгімонт Ваза, страціўшы такім чынам апошняе спадзяванне авалодаць Маскоўская дзяржавай, павярнуў назад.

З адыходам караля Хадкевіч застаўся сам-насам з сіламі новага маскоўскага цара Міхаіла Раманава, які гарэў жаданнем вярнуць страчанае за гады "смуты". Асабліва цяжкая сітуацыя склалася ў 1615 годзе, калі ўзнікла сур'ёзная пагроза Смаленску. І вось тут прыдаўся знаёмы Хадкевічу яшчэ па Інфлянцкай вайне Аляксандр Лісоўскі.

Адышоўшы з такімі ж авантурнікамі, як і сам, да самазванцаў, Лісоўскі, узначаліўшы загоны лёгкай кавалерыі, стаў героем вайны на ўсходзе. Тысячы яго вершнікаў-лісоўчыкаў на хутканогіх конях, не абцяжараныя абозам, рабілі глыбокія рэйды па тылах праціўніка, наводзячы паніку і жах на маскоўцаў. За заслугі перад Рэчай Паспалітай Лісоўскаму былі дараваныя правіны ў Інфлянтах. Памірыўся са сваім колішнім падначаленым і Ян Хадкевіч. У той цяжкі 1615 год, каб адцягнуць хоць частку царскіх войскаў ад Смаленска, гетман выкарыстаў лісоўчыкаў. На ягоны загад палкоўнік Аляксандр Лісоўскі пайшоў на Севершчыну, а затым — Паволжа. У часе гэтага рэйду была разгромленая значная частка маскоўскага войска, захоплена шмат гарадоў, спустошаны вялікія тэрыторыі. Легендарныя беларускія вершнікі дасягнулі нават зледзянелых берагоў Белага мора.

У 1617 годзе на Маскву рушыла новае войска Рэчы Паспалітай. Гэтым разам па карону ішоў каралевіч Уладзіслаў, якога яшчэ ў 1610 годзе частка маскоўскага баярства абрала сваім царом. Ізноў на чале ўзброеных сілаў быў Ян Кароль Хадкевіч. Але, сустрэўшыся з арганізаваным і ўзмацнелым праціўнікам, паход спыніўся перад сталіцай. І нарэшце пасля беспаспяховага штурму горада ў канцы 1618 года было дасягнутае Дзявулінскае замірэнне.

Так скончылася гэтая вайна, што працягвалася фактычна блізу паўтара дзесятка гадоў. Паводле дамовы, Вялікае Княства вярнула большыню раней страчаных земляў — Смаленшчыну са Смаленскам, Дарагабужам і Рослаўлем, Браншчыну са Старадубам, а таксама поў-

нач нашага Падзвіння з Невелем і Себежам. Праўда, вярнула не надоўга — да сярэдзіны гэтага ж XVII стагоддзя.

Ян Кароль Хадкевіч вяртаўся з вайны стомлены і схварэлы. Гады на ўсходзе былі праведзеныя ў цяжкім змаганні, у якім былі перамогі і паразы. Але, як заўсёды бывае, найбольш вярэдзілі памяць і душу апошнія. А тутдадаліся і асабістыя трагедыі. Памёр ягоны адзіны нашчадак па мячы, улюбёны сын Гаранім. Не паспеў прыглухнуць боль ад гэтай непапраўнай страты, як неўзабаве пасля Дзявулінскага замірэння новы ўдар абрынуўся на старэлага ўжо гетмана — пайшла з Божага свету яго каханая Зося.

Самотнымі і халоднымі сталі для адзінокага ваяра сцены новага замка ў Ляхавічах. Але такія асобы, як Ян Кароль Хадкевіч, звычайна не належаць сабе. Яны павязаныя традыцыямі свайго роду, служэннем айчыне, дзяржаве. І магнат, які канчаў ужо па тым часе шосты дзесятак жыцця, зрабіў яшчэ адну спробу жыццёвага рэваншу. У лістападзе 1620 года ён ажаніўся з маладзейшай за сябе на саракоўку дваццацігадовай Ганнай з славутага роду Астрожскіх. Аднак не сталася старому гетману пацехі з новай сям'і. Не ўдалося яму падмацаваць адпачынкам знясіленае гадамі, паходамі, бітвамі, хваробамі цела. Бацькаўшчына зноў клікала сына на дапамогу. Цяжкія хмары вайны ўжо засланялі паўднёвы далягляд Рэчы Паспалітай, і адразу ж пасля вяселля Хадкевіч выехаў на сойм у Варшаву, дзе разглядалася пытанне супраціву Турэччыне.

## ХАЦІНСКАЯ ВАЙНА

Пагорш.анне стасункаў з Турэччынай * Збіранне сілаў * Каму кіраваць войскам? * Хацінскі лагер * Месяц цяжкіх баёў * Геройства нашых жаўнераў * Начныя вылазкі * Апошняя бочка пораху * Смерць і перамога

Паўднёвым суседам Рэчы Паспалітай была неспакойная Асманская імперыя, якая да пачатку стагоддзя безупыннымі войнамі пашырыла свае ўладанні на велізарныя прасторы паўночнай Афрыкі, Пярэдняй Азіі і паўднёва-усходняй Эўропы. Паўночныя межы яе ўладанняў падступілі пад Вену і Альбоў[22].

Трэба адзначыць, што стасункі паміж Турэччынай і нашай дзяржавай не былі асабліва драматычнымі. Стамбул больш цікавіла экспансія ў Цэнтральную Эўропу праз Падунаўе. Праўда, землі Украіны і нават паўднёва-ўсходняй Польшчы даволі часта цярпелі ад рабаўнічых нападаў турэцкіх леннікаў — крымскіх татараў. Але не заставаліся ў даўгу і запарожскія казакі. Спускаючыся на чоўнах па Дняпры ў Чорнае мора, яны не толькі вынішчалі крымскае ўзбярэжжа, але часам нават пагражалі прыгарадам сталіцы самой імперыі.

Аднак у часы панавання Жыгімонта Вазы дачыненні паміж Стамбулам і Варшавай значна пагоршыліся. Кароль Рэчы Паспалітай уступіў у альянс з манархамі Аўстрыі і Нямеччыны — Габсбургамі. А менавіта іх уладанні былі шчытом на шляху турэцкага наступу на хрысціянскую Эўропу. Значыць, хаўруснік Габсбургу аўтаматычна рабіўся турэцкім праціўнікам. Вузел канфрантацыі завязваўся ў памежнай Малдавіі, дзе ва ўсталяванні ўплываў супернічалі польска-ўкраінскія і турэцкія феадалы. Лакальныя сутычкі, ініцыятарам якіх фактычна сталася Рэч Паспалітая, неўзабаве перараслі ў сапраўдную вайну, што запатрабавала вялізных намаганняў з абодвух бакоў. Вайна атрымала найменне Хацінскай.

Восеньскі паход 1620 года польска-ўкраінскіх сілаў у Малдавію скончыўся поўным разгромам войска Кароны і смерцю іх гетмана.

Заахвочаны такой лёгкай перамогай, тагачасны малады і ганарлівы султан Асман II, не марудзячы, пачаў рыхтаваць паход на поўнач. Праз свайго пасла ён паведамляў Маскве, што хоча разграміць Польшчу і выйсці на берагі Балтыйскага мора. Задаволіў бы яго, мусіць, і захоп адной Украіны. Натуральным альянтам Турэччыны

---

[22] Даўнейшы беларускі назоў места Львова.

стала на той час Швецыя, якая зноў распачала ваенныя дзеянні ў Інфлянтах.

У чэрвені 1621 года вялізная турэцкая армія, якая, па сведчаннях сучаснікаў, з дапаможнымі сіламі і чарнаморскімі татарамі налічвала да 150 тысяч ваяроў, рушыла ў бок Малдавіі і Украіны.

Збірала сілы і Рэч Паспалітая. У большыню эўрапейскіх дзяржаваў накіраваліся паслы прасіць дапамогі, спрабаваць утварыць антытурэцкую хрысціянскую кааліцыю. Аднак без поспеху. На кантыненце ўсё яшчэ бушавала вялікая вайна паміж каталікамі і пратэстантамі. Таму рэальнымі былі спадзяванні толькі на свае сілы. Рэгіянальныя соймікі, а затым і Сойм вальны (усеагульны) ужо з верасня 1620 года, з часу паразы ў Малдавіі, заняліся падрыхтоўкай абароны краіны. Рабілі, як ніколі, энергічныя захады па збіранні грашовых сродкаў і мабілізацыі войска.

Востра паўстала пытанне аб военачальніку. У Польшчы тады не было асобы, здольнай кіраваць ваеннымі дзеяннямі. І тут выбар караля выпаў на выпрабаванага ў шматгадовых змаганнях са Швецыяй і Маскоўшчынай вопытнага палкаводца вялікага гетмана літоўскага Яна Кароля Хадкевіча. Выбар манарха быў падтрыманы бальшынёю ўплывовых феадалаў Рэчы Паспалітай.

Клопаты былі ўжо звыклыя. Падаткі на вайну паступалі са спазненнем. Адпаведна былі цяжкасці з найманнем войска. Не хапала коней, артылерыі, харчоў, медычнага забеспячэння. Некаторыя вайсковыя аддзелы, што ішлі ў бок Малдавіі, займаліся рабаўніцтвам на сваёй жа тэрыторыі.

Асноўныя беларускія сілы рухаліся з-пад Вільні, Полацка ды Смаленска. Дарэчы, якраз са Смаленска везлі так неабходную ў будучай вайне артылерыю, а таксама харчаванне. Беларускае войска злучылася ў Берасці. А адтуль паўз правабярэжжа Буга дасягнула Альбова, дзе яго вітаў сам гетман. Сканцэнтраваныя першапачаткова ў Варшаве, кіраваліся на поўдзень польскія сілы пад кіраўніцтвам каралевіча Уладзіслава. Прыйшлі на дапамогу і славутыя лісоўчыкі.

Надзвычай важна было атрымаць дапамогу казакоў. У пачатку XVII стагоддзя Запарожская Сеч стала фактычна аўтаномнай украінскай дзяржавай у Рэчы Паспалітай са сваім войскам, адміністрацыяй, судом. Яна абапіралася перадусім на першакласную конніцу, якой у адказныя моманты набіралася дзесяткі тысяч вершнікаў. Аднак напярэдадні турэцкай вайны стасункі паміж Варшавай і Запарожжам былі вельмі напятыя. Прычынай гэтага было найперш імкненне польскіх і ўкраінскіх феадалаў умацавацца на ўрадлівых чарназёмах Падняпроўя. Ідэалагічным сцягам казацтва стала праваслаўе, якое

шмат цярпела пасля Берасцейскай царкоўнай вуніі. Акрамя таго, украінцы насцярожана сачылі за развіццём дачыненняў паміж Асманскай імперыяй і Рэчай Паспалітай, баючыся, каб не адбылося замірэння са Стамбулам іх коштам. Насцярога мела падставу — султан асабліва патрабаваў знішчэння Сечы.

Напружаныя перамовы паміж каралеўскім дваром і казацкай старшынай[23] прывялі ўрэшце да паяднання. Істотную ролю ў гэтым адыграла пазіцыя канстантынопальскага патрыярха, які заклікаў казакоў да абароны Святога Крыжа ад няверных мусульман. 8 жніўня магутнае па тых часах трыццацітысячнае казацкае войска, складзенае пераважна з украінцаў, пераправілася цераз Днестр. Узначальваў яго даўні паплечнік Хадкевіча яшчэ па маскоўскай вайне гетман Пятро Канашэвіч-Сагайдачны. Казацкія сілы спусташалі Малдавію, пакідаючы туркаў без правіянту. Акрамя таго, яны рабілі засады, трымалі абарону на пераправах і ў цяснінах, затрымліваючы рух Асманавых сціжмаў. Гэтым даваўся такі неабходны Хадкевічу час для падрыхтоўкі адпору.

Частка казакоў на чоўнах-чайках распачала атакі на марскія шляхі туркаў у Чорным моры, вынішчала ўзбярэжныя гарады і вёскі. Уражанне ад гэтага было такое вялікае, што сярод акружэння султана нават узнікла думка аб вяртанні войска ў межы імперыі.

Улічыўшы стасункі сілаў (прыкладна адзін супраць трох), вялікі гетман літоўскі выбраў абарончую тактыку. Вызначыў для лагера адпаведнае месца каля замка Хацін[24] на малдаўскім правабярэжжы Днястра (каб рака адразала жаўнерству шлях магчымых уцёкаў з поля бітвы). Тут, пры замкавых мурах, і пачалі спешна будаваць земляныя ўмацаванні.

Усё войска Рэчы Паспалітай пад Хацінам мела каля 60 тысяч жаўнераў. Значную частку яго складалі выхадцы з польскіх земляў, былі ў ім таксама найміты з Прусіі, Сілезіі, Нямеччыны. Крыху меншыя па колькасці фармацыі прыйшлі з Беларусі, Летувы і Інфлянтаў. Але яны мелі вялікі баявы вопыт і ўзначальваліся такімі дасведчанымі ваярамі, як Аляксандр Сапега, Мікалай Зяновіч, Мікалай Касакоўскі, Ян Рудаміна. Таму менавіта землякам давяраў гетман найбольш важныя ўчасткі абароны, сваю гусарыю кідаў у самае пекла бою.

У бітве пад Хацінам асабліва трэба адзначыць ролю ўкраінскіх казакоў. Яны, складаючы блізу паловы войска Рэчы Паспалітай. былі найбольш загартаваныя і спрактыкаваныя ў змаганні з ворагам, з

---

[23] Старшына — кіраўніцтва Запарожскай Сечы.
[24] Цяпер раённы цэнтр Чарнавіцкай вобласці Украіны.

якім сустракаліся да гэтага неаднойчы. Украінцы баранілі свой край, які быў тут жа, за Днястром. Таму сярод іх амаль не было дэзерціраў і яны выявілі надзвычайную мужнасць і храбрасць у адбіванні шматлікіх турэцка-татарскіх штурмаў, у контратаках і начных вылазках.

Аснову войска Асмана II складалі туркі з Малой Азіі і эўрапейскай часткі імперыі — Румеліі. Былі ў ім таксама арабы, румыны, малдаване, загоны з некаторых балканскіх краёў. Асабліва вылучалася сваім фанатызмам і ваяўнічасцю янычарская пяхота, у якую набіралі захопленых хрысціянскіх хлопчыкаў, выгадаваных у мусульманскі духу і з малалецтва рыхтаваных да вайны. У турэцкім войску была вельмі моцная артылерыя — пад Хацін падвезлі больш за шэсць дзесяткаў гарматаў з італьянскай найманай абслугай. Акрамя ўзброеных ваяроў у турэцкім лагеры было і некалькі дзесяткаў тысяч слугаў. На дапамогу Асману прыйнілі крымскія і прычарнаморскія татары. Яны мала прыдаваліся для штурму хацінскага лагера, таму мелі спецыфічную задачу: вынішчаць блізкае і далёкае, ажио за Альбоў, заплечча войскаў Рэчы Паспалітай, перараазаць шляхі іх забеспячэння.

Аднак мелі туркі і слабыя бакі. Бальшыня іх была ўзброеная толькі халоднай зброяй ды лукамі. Пяхота не вельмі дасканала валодала стрэльбамі-янчаркамі. Малымі аказаліся запасы харчу для людзей і пашы для коней. Ваяры былі пераважна з цёплых краёў, а тут якраз пачыналася халодная восемь. Паўплывалі на ход будучай бітвы спрэчкі і канкурэнцыя ў вайсковым кіраўніцтве Асмана, а таксама нявопытнасць маладога султана. Такім чынам, ні харчовымі і фуражнымі запасамі, ні вопраткай, ні нават характарам праціўнік не быў прыстасаваны да ўпартага пазіцыйнага змагання. Адзінае, чаго ў туркаў было з лішкам, дык гэта пораху.

Тым часам разнамоўнае і разнавернае войска Хадкевіча задзіночвалася магутнай ідэяй абароны хрысціянства і эўрапейскай цывілізацыі ад мусульманскай навалы. У бальшыні складзенае з жыхароў Рэчы Паспалітай, яно бараніла сем'і, родны край, сваю дзяржаву.

Перад падыходам турэцкай арміі Ян Хадкевіч паспеў умацаваць свой хацінскі лагер. Размяшчэнне войска прыкрывалі даўжэзныя, на некалькі кіламетраў, валы і равы. Найважнейшыя ўчасткі мелі дадатковыя драўляна-земляныя ўмацаванні, з-за якіх можна было весці флянковы[25] агонь. Паўночная лінія абароны абапіралася на Хацінскі мураваны замак, які будавалі беларускія майстры яшчэ пры князі Вітаўце, на пачатку XV стагоддзя. Умацаванні ўжо былі састарэлыя, вежы і сцены не мелі байніц для гарматнага бою, аднак гэта быў на-

---

[25] Бакавы (ад ням. Flanke — бок).

www.kamunikat.org

дзейны заслон ад ядраў праціўніка. Побач знаходзілася і мураваная царква, таксама ператвораная ў моцны асяродак абароны. З усходу лагер засланяў хуткаплынны Днестр і яго скалісты высокі бераг. Зпаўднёвага боку знаходзіўся яр з перасохлым ручаём.

Паўночную і заходнюю частку пазіцыі заняло польскае (кароннае) войска. Паўднёвы кірунак, адкуль чакаўся асноўны турэцкі націск, павінны былі абараняць беларуска-летувіскія сілы, у тым ліку лісоўчыкі, а таксама ўкраінскія казакі.

Вялікі гетман як мог гартаваў баявы дух свайго войска. Пры адной з размоваў пра вялікую сілу туркаў ён ухапіўся быў за эфес шаблі і крыкнуў: "Гэта іх палічыць!" Даведаўшыся ж пра запал і апантанасць султана, трапна выславіўся па-беларуску: "Сярдзіты сабака — ваўкам страва".

2 верасня передавыя турэцкія загоны з амаль стокіламетровай калоны падышлі пад Хацін і адразу ж пачалі атакаваць запарожцаў, якія яшчэ ўмацоўвалі свой лагер.

Ян Хадкевіч, разумеючы, што гэта толькі частка войска султана, пастанавіў ударыць па ёй усімі наяўнымі сіламі, каб знішчыць як мага болей праціўніка. Такім меўся быць першы ход у баталіі сівавалосага беларускага ваяра. Палкаводзец вывеў свае загоны за ўмацаванні і пачаў натхняць да бітвы: "Зваліцеся на гэтых агіднікаў, змятайце іх ацяжэлыя турбанамі галовы зручным пакосам шабляў. Вось Днестр ззаду непраходны, а вось наўкол залева турэцкіх і татарскіх сціжмаў. Няма ніякай спадзеўкі на ўцёкі — тут нам біцца і перамагчы альбо згінуць нам кажа неабходнасць!"

Аднак султан, які чуў пра незвычайную моц конніцы Хадкевіча, не прыняў адкрытай бітвы. Нашае войска сустрэў артылерыйскі абстрэл. Адначасова туркі скіравалі ўдар на запарожцаў. Нягледзячы на вялікія страты ад агню казацкіх рушніцаў, янычарская пяхота прабілася да самай лініі вазоў і на іх закіпела сеча. Тады гетман паслаў на дапамогу запарожцам нямецкую ды польскую пяхоту, якая адкрыла флянковы агонь. Распачала абстрэл і беларуская артылерыя. Парадзелыя янычарскія шэрагі захісталіся, і казакі, падтрыманыя вершнікамі суседніх харугваў, кінуліся ў контратаку. Туркі пачалі адступаць, і толькі моцны агонь з гарматаў прыпыніў наступ войска паўднёвай групоўкі Хадкевіча.

Ужо першы дзень бітвы быў адзначаны многімі ахвярамі: некалькі сотняў забітых і параненых туркаў, да трыццаці ваяроў страцілі ўкраінцы і беларусы.

Назаўтра, з'імітаваўшы атаку на царкву-мураванку, туркі зноў пачалі артылерыйскі абстрэл і штурм казацкага табара. Аднак запа-

www.kamunikat.org

рожцы рукапашнымі контратакам} паспяхова адбівалі націск. Пры гэтым нават здабылі некалькі варожых гарматаў.

Па-сапраўднаму сітуацыя стала сур'ёзнай 4 верасня, калі падышла бальшыня турэцкіх сілаў. Зранку зноў пачалася атака на царкву, але потым уся агнявая моц скіравалася на казацкі табар. Адразу ж па абстрэле лавіна пяхоты з аглушальным рыкам кінулася на штурм. Казакі, якія ў адчайнай храбрасці не саступалі янычарам і перавышалі іх славянскай упартасцю, сустрэлі праціўніка перад вазамі зацятым рукапашным боем.

У крытычны момант, калі значна большыя турэцкія сілы прарваліся да лініі абароны, а некаторыя галаварэзы ўжо біліся ў самым абозе, Хадкевіч кінуў на дапамогу беларускую пяхоту і частку конніцы. Туркі, заслаўшы поле трупамі, адступілі. Аднак султан замест стомленых боем і парадзелых загонаў, не зважаючы на страты, пасылаў на штурм пазіцыі казакоў усё новыя сцікмы. І так працягвалася амаль увесь дзень. Але пад вечар казацкая конніца і пяхота ў шалёнай контратацы адкінулі туркаў, захапілі частку іх гарматаў і нават прарваліся ў лагер праціўніка.

І толькі ноч перапыніла змаганне.

Гэты дзень быў, можа, сама крывавым за ўвесь час Хацінскай вайны. Туркаў лягло болей за тры тысячы, казакоў і лісоўчыкаў — 800, вялікакняскія і каронныя войскі страцілі да трох сотняў ваяроў.

Такім вось чынам распачалася гістарычная бітва пад Хацінам. Дзень пры дні. Аднак найцяжэй стала сёмага верасня.

Да абеду туркі вялі знішчальны гарматны абстрэл казацкага табара і раз-пораз яго атакавалі, праўда, так і не здолеўшы прарвацца да ўмацаванняў. У абед султан знянацку ўдарыў на сутык абароны вялікакняскага войска з палком польскага каралевіча. Дзве перадавыя роты былі амаль цалкам высечаныя. Затым янычары праламалі абарону польскай і нямецкай пяхоты, захапілі галоўны вал і ўварваліся ў глыбіню лагера. Хадкевіч, імгненна ацаніўшы ўвесь драматызм сітуацыі, паслаў на небяспечны ўчастак спешаных ваяроў казацкага строю. Туркі былі вымушаныя адступіць за вал.

Разгарачаны стратай такой блізкай, здавалася, перамогі, султан накіраваў новыя сілы на той жа ўчастак абароны Хадкевіча. Падпусціўшы праціўніка пад самы вал, гетман нарэшце ўжыў сваю найбольш выпрабаваную моц. Праз "ліцьвінскую" браму былі выведзены найлепшыя харугвы беларускіх гусараў пад камандай Мікалая Сяняўскага, Мікалая Зяновіча, Пятра Апалінскага, Яна Рудаміны і Аляксандра Сапегі. Кіраваў гусарыяй непасрэдна сам гетман. Каля тысячы вершнікаў урэзаліся ў фланг турэцкіх сціжмаў. Хоць туркі

www.kamunikat.org

напачатку адчайна супраціўляліся, але іх шыхты былі здратаваныя цяжкімі коньмі, прабітыя гусарскімі дзідамі, працярэбленыя шаблямі. Мусульманскі фанатызм не вытрымаў перад скрышальным напорам малайцоў з-над Дняпра, Дзвіны і Немана. Недабіткі ратавалі жыццё ўцёкамі. Толькі прыцемак ранняга восеньскага вечара спыніў вынішчэнне туркаў.

Гэтая гусарская атака пад Хацінам гучным рэхам славы шырока і далека разляцелася па Эўропе.

Гусарскія шаблі 7 верасня працверазілі султана і астудзілі яго запал. Простыя разлікі паказалі, што пры такім развіцці падзеяў перад умацаваннямі "няверных" у яго неўзабаве проста не застанецца ваяроў. Туркі пачалі мяняць тактыку. Яны вырашылі шчыльна блакаваць войскі Хадкевіча і частымі артылерыйскімі абстрэламі, кароткімі атакамі асобных загонаў знясіліць іх, вымучыць голадам і хваробамі і ўрэшце прымусіць да капітуляцыі.

Змаганне, такім чынам, перарасло ў зацяжную пазіцыйную вайну.

Асабліва дакучалі туркі запарожцам, не пакідалі ў спакоі сваіх заклятых ворагаў. Пра адзін такі напад на казакоў мясцовы армянскі храніст пісаў: "Шматтысячнае войска няверных з усіх бакоў, быццам цёмная хмара, абкружыла войска хрысціян так, што не відаць было ні поля, ні гораў". Аднак украінскія ваяры, хоць і неслі страты, трымаліся нязломна, абстрэламі і табельным! контратакамі стрымлівалі мусульман. Больш за тое, казакі пачалі практыкаваць начныя збройныя вылазкі на пазіцыі праціўніка. Запарожскія смелякі звычайна вярталіся з малымі стратамі, абцяжараныя багатай здабычай — харчаваннем, коньмі, каштоўнасцямі. Падахвочаныя такімі поспехамі, да казакоў нярэдка далучаліся жаўнеры з беларускіх і польскіх палкоў. Гэтыя акцыі вынішчалі турэцкае ваярства, дэмаралізавалі яго, сеялі паніку і няпэўнасць у варожых шыхтах.

Аднак становішча ў лагеры Хадкевіча выглядала цяжкім. Шмат было страчана ваяроў у штодзённых бітвах і змаганнях з туркамі, параненыя і хворыя перапаўнялі намёты. Канчаліся запасы пораху. А найцяжэй было з харчаваннем. Ставала хіба толькі мяса, бо коні без аўса і сена гінулі масава. Дрэвы і кусты пад Хацінам стаялі голыя, хоць да лістапада было яшчэ далека — лісце пайшло на корм жывёле. Найцяжэй было ўкраінскім казакам, мала падрыхтаваным да такой доўгай аблогі. Можа, гэта была адна з прычынаў іх частых начных вылазак. Захопленая здабыча абменьвалася ў лагеры на хлеб. Сена ж для сваіх коней казакі здабывалі літаральна шабляй — дзённымі атакамі, калі пярэднія секліся з туркамі, заднія наразалі траву ў мяхі.

Не лягчэй, аднак, было і туркам. Іх таксама даўно ўжо ціснуў голад, і кошт хлеба ў стане султана вырас у 60 разоў. А тут пачыналіся незвычайныя халады з дажджамі, і хваробы сталі вырэджваць шыхты ваярства. Аднак найбольшыя страты войска, вымушанае атакаваць Хадкевіча, мела пад час баёў. Падаў баявы дух. Шырылася дэзерцірства. Яшчэ ў пачатку Хацінскай бітвы Асман II абвясціў, што не стане есці, пакуль лагер няверных не будзе ўзяты. Але зараз ён ужо не ўспамінаў пра тое абяцанне, а побач з султанскім шатром панылa стаялі пахудзелыя сланы. Згасала надзея на паходда берагоў Балтыкі...

Ян Кароль Хадкевіч, бачачы крытычны стан свайго войска, пакуты казацтва, панічныя настроі сярод часткі жаўнераў, 18 верасня склікаў нараду: генеральнае кола вышэйшага афіцэрства, каралеўскіх камісараў і казацкай старшыны. Воблік прысутных — схуднелых, абдзёртых, параненых — красамоўна сведчыў пра сітуацыю. Сам смяротна хворы, гетман не меў сілы падняцца з ложка. Хадкевіч паставіў пытанне перад вайсковым кіраўніцтвам проста і ясна — ці нелепей адысці з-пад Хаціна? Пасля хвіліннай паўзы першым азваўся Канашэвіч-Сагайдачны: "Лепей з годнасцю за айчыну паміраць, чым кідацца наўцёкі, нягодныя людзей рыцарскіх". Мужнага казацкага гетмана з энтузіязмам падтрымалі прысутныя, а гэтага і сгтадзяваўся палкаводзец.

Змагарны настрой пашырыўся сярод войска. Быццам новыя сілы знайшліся ў змардаваных мужчынскіх душах і целах. Найперш, улічваючы, што войска прыкметна паменела, пастанавілі скараціць лінію абароны. Бліжэй да замка былі ўзведзеныя новыя ўмацаванні, старыя ж засыпаныя. Толькі лісоўчыкі, больш звыклыя да шаблі, чым рыдлёўкі, не крануліся з месца, і зараз іх лагеру вораг пагражаў ужо з трох бакоў. Улічыўшы пасіўнасць гэтаксама змучаных туркаў, казакі і тыя ж лісоўчыкі ўзмацнілі вылазкі супраць ворага, асабліва начныя. Здабычай станавіліся сотні коней, вярблюды, зброя і каштоўнасці, нішчылася жывая сіла праціўніка.

А стан здароўя вялікага гетмана рабіўся крытычны. Пасівелы ваяр дажываў апошнія дні, вымучаны камянямі ў нырках, падаграй. А ўрэшце прыступы эпілепсіі пачалі руйнаваць гэтае калісьці моцнае і, здавалася, нязноснае цела, звыклае да сядла, імклівых кавалерыйскіх атакаў, доўгіх пераходаў, холаду і спёкі, жыцця ў паходным намёце. Якія думкі прыходзілі ў ягозгасалы розум цёмнымі начамі пад Хацінам? Успаміны пра лагодныя пагоркі пад Цімкавічамі, славу Кірхгольма, маразы Маскоўшчыны ці сонца Італіі? Або шкадаванне,

што так і канчаецца на ім слаўны род Хадкевічаў быхаўскай галіны? А можа, найбольш турбаваў лёс ягонага войска?

23 верасня Ян Кароль Хадкевіч, ужо бязмоўны, яшчэ знайшоў сілы перадаць гетманскую булаву свайму наступніку Любамірскаму, а назаўтра па абедзе пасля цяжкога канання пакінуў гэты свет. "Пан гетман памёр, а з ім вялікае шчасце Айчыны мілай", — занатаваў сучаснік. "Слава несмяротная яго на вякі вечныя жыць будзе", — дадаваў іншы.

Пазней пра выдатнага сына беларускай зямлі напішуць: "Лёс ласкавы надзяліў яго ўсім, што патрэбна для здабыцця несмяротнай славы. Даў яму паходжанне са знакамітага роду па мячы і па кудзелі, цудоўны шлюб, багацце незвычайнае, дасканалы склад цела з усімі рысамі высакароднага правадыра, поўны годнасці воблік: арліны нос, высокі лоб, ваяўнічы выраз. Акрамя таго, ён дасканала валодаў замежнымі мовамі і тымі навукамі, якія называем гуманістычнымі, найперш, аднак, шмат працы прысвячаў паглыбленню вайсковага майстэрства. Гэтаму аддадзены быў з маленства... Вылучаўся вялікай адпорнасцю на цяжкасці, на спёку і холад, на голад, вялікай таксама чуйнасцю ў расстаўленні старожы, спрытам у захопе "языка", такой спраўнасцю і хуткасцю ў шыкаванні баявых парадкаў, што параўнаўся ў гэтым з найвялікшымі старажытнымі і сучаснымі палкаводцамі. Добра абазнаны быў таксама ў гісторыі і выкананні памераў геаметрычных. Старанна вывучаў радаводы шляхотных коней і ўзбраенне. Яго твар, рукі, хада, голас, вопратка сведчылі пра тое, што ён створаны для вайны".

Вестка пра смерць палкаводца дайшла і да Асмана. Гэта акрыліла туркаў, і яны зноў ухапіліся за зброю. Хацінскаму лагеру давялося перажыць некалькі занятых штурмаў, асабліва цяжка было ўсё тым жа казакам і лісоўчыкам. Але гэта былі ўжо перадсмяротныя канвульсіі звера. У туркаў яшчэ быў порах для бітвы, але не хапала для яе ні сілы, ні волі.

Першыя спробы перамоваў пачыналіся ў дні, калі яшчэ жыў Ян Хадкевіч. Няўдача ж апошніх намаганняў зламаць супраціў войска Рэчы Паспалітай прыспешыла справу замірэння. Зашнуравалі паслы паміж стаўкамі султана і Любамірскага, у спрэчках абмяркоўваліся ўмовы спынення баёў і дэталі будучых дачыненняў паміж дзвюма дзяржавамі. Нарэшце 9 кастрычніка быў падпісаны мір, паводле якога мяжа паміж Асманскай імперыяй і Рэчай Паспалітай пакідалася ранейшай. Гэта была перамога! А ў лагеры ж абаронцаў Хаціна на той дзень заставалася толькі адна бочка пораху...

www.kamunikat.org

І рушылі войскі з-пад Хаціна. Турэцкія — на поўдзень, нашы — на поўнач і ўсход, дадому.

Чакалі родныя і блізкія і беларускіх ваяроў. Але далека не ўсе вярнуліся з-пад малдаўскага замка жывымі на Бацькаўшчыну. У фарным касцёле Наваградка і сёння захоўваецца каменная табліца, пастаўленая тут у 1643 годзе ў памяць палеглых пад Хацінам землякоў. На барэльефе выявы Яна Рудаміны, ветэрана яшчэ Інфлянцкай вайны, і яго паплечнікаў. Укленчылі рыцары з складзенымі рукамі, а перад імі на доле — звал янычарскіх трупаў і галоваў. А колькі такіх памятных дошак па касцёлах і цэрквах Беларусі не захавалася да нашых дзён?

www.kamunikat.org

## ПАСЛЯСЛОЎЕ

14 кастрычніка ў катэдры Камянца-Падольскага, куды першапачаткова адышло нашае войска, было ўрачыста пахавана цела Яна Кароля Хадкевіча. Але гэтае месца не сталася яго апошнім прытулкам. Праз некалькі тыдняў маладая ўдава перавезла труну з нябожчыкам у сваё родавае гняздо — у Астрог на Валыні. Аднак з прычыны ўзніклых спрэчак за цела, а найбольш, мабыць, за маёмасць гетман быў зноў пахаваны толькі наступнай восенню, амаль праз год, у фарным мясцовым касцёле. У часе паўстання Багдана Хмяльніцкага парэшткі нябожчыка вывозіліся ў Польшчу, а пасля замірэння на Украіне былі вернутыя назад. У 1722 годзе езуіты перанеслі пахаванне ў новы касцёл у тым жа Астрогу. Аднак у XIX стагоддзі касцёл згарэў і быў зруйнаваны. Зніклі і сляды магілы вялікага палкаводца.

Славу Ян Хадкевіч спазнаў напоўніцу яшчэ пры жыцці. Ён дасягнуў усіх магчымых становішчаў у кіраўнічай герархіі дзяржавы — стараста жамойцкі, віленскі ваявода, палявы, а затым вялікі гетман літоўскі, урэшце, галоўны начальнік усіх войскаў Рэчы Паспалітай, радца Вялікай Рады Княства і сенатар Рэчы Паспалітай. Кароль абдорваў свайго палкаводца ўшанаваннямі і годнасцямі, а таксама шматлікімі зямельнымі ўладаннямі. Дзівіліся поспехам ваяра валадары блізкіх і далёкіх краёў. Мастакі малявалі яго партрэты, карціны з выявамі пераможных бітваў. Праслаўлялі Яна Хадкевіча каталіцкі дзяяч і прамоўца Пётра Скарга і лацінамоўны паэт Мацей Сарбеўскі. Перамозе ў Хацінскай вайне прысвяціў паэму "Асман" харвацкі паэт пачатку XVI I стагоддзя Іван Гундуліч.

Не знайшло супачыну на чужыне цела Яна Кароля Хадкевіча. Блукае па чужых краях і ягоная слава, а на роднай Беларусі ніяк не прызнаюцца да свайго сына. Грэх ён меў вялікі перад савецка-камуністычнымі ідэолагамі — не валодаў пралетарска-сялянскай свядомасцю, бо разграміў паўстанне казакоў і беднаты. Сувораву за Пугачова прабачылі, а Хадкевічу за Налівайку — не.

Нават у першай палове 90-х гадоў, калі ціск абэцэдаршчыны на нашых гісторыкаў часова быў паслабеў, яны па звычцы міналі асобу Яна Хадкевіча. Як міналі і перамогі беларускага войска на палях Інфлянтаў, у вайне з Маскоўшчынай пачатку XVII стагоддзя, у бітве пад Хацінам — гэтыя зусім яшчэ не адгорнутыя старонкі нашае мінуўшчыны.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

www.kamunikat.org

## ЗМЕСТ

УСТУПНАЕ СЛОВА
НАРАДЖЭННЕ АРЛЯНЯЦІ
(Часы малога Іінa • Вайна з МаскоЦшчынай • Люблінская вунія • Славуты радавод • IIa ніве культуры і на пабаявішчы • Першыя крокі... • П рыклад бацькі • Узгадаванне рыцарскага духу)
АРОЛ РАСПРОСТВАЕ КРЫЛЫ
(Віленскія навукі • У эўрапейскіх універсітэтах • На пасадзе — новы манарх • Вяртанне на радзіму • Жаніцьба • Змаганне з казакамі Налівайкі • Чаходы ў Падунаре)
НА ІНФЛЯНЦКАЙ ВАЙНЕ
(Пачатак ваенных дзеянняў • Супярэчкі з Радзівілам Ннруном • Палітычныя захады Яна Хсідкевіча • Першыя перамогі •Хто такія гетманы? • Крылатыя вершнікі • Узбраенне і войсковая тактыка)
ПЕРАМОГА ПАД КІРХГОЛЬМАМ
(Абвастрэнне сітуацыі • Аблога Рыгі Карлам IX • Хадкевіч спяшаецца на дапамогу • Выбар месца бітвы • Гераічныя чыны гусарыі • Разгром шведар • Розгалас пра сланную перамогу)
МАРНАСЦЬ НАМАГАННЯЎ
(Змена арыентацыі каралеўскага двара • Рокаш Зебжыдоускага • Зноў у Інфлянтах — адваёва страчанага • Палітычнае становішча на Цсходзе • Самазванцы • Пачатак адкрыгпай вайны • У Маскве • Замірэнне)
ХАЦІНСКАЯ ВАЙНА
(Пагоршанне стасункаЦ з Т,урэччынай • Збіранне сілаў • Каму кіраваць войскам?• Хацінскі лагер • Месяц цяжкіх баііЦ • Геройства нишых жаўнераЦ • Начныя вылазкі • Апошняя бочка пораху • Смерць і перамога)
ПАСЛЯСЛОЎЕ

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ Серыя акадэмічная

Навукова-папулярнае выданне

Чарняўскі Міхась

**ПРАВАДЫР КРЫЛАТЫХ ВЕРШНІКАЎ**
ЯН КАРОЛЬ ХАДКЕВІЧ

Рэдактар Алесь Зьмітровіч
Карэктар Яніна Марціновіч
Набор Алена Лобач
Макетаванне Наталя Санько

www.kamunikat.org

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## КНІГІ СЕРЫІ "НАШЫ СЛАВУТЫЯ ЗЕМЛЯКІ"

*Выйшлі з друку ў 1988-1998 гг.*

Грыбкоўскі В., Гапоненка В., Кісялёў У. **Прафесар электраграфіі і магнетызму**
Пра Якуба Наркевіча-Едку (1847-1905), адкрывальніка электраграфіі і бяздротавай перадачы электрычных сігналаў

Мархель У. **Вяшчун славы і волі**
Пра Уладзіслава Сыракомлю (1823-1862), выдатнага паэта-дэмакрата

Галакціёнаў С., Яцкевіч Г. **Рыцар навукі з Нянькава**
Пра Уладзіслава Дыбоўскага (1838-1910), таленавітага даследніка прыроды і фальклярыста

Арлоў У. **Асветніца з роду Усяслава**
Пра Еўфрасінню Полацкую (~ 1110-1173), беларускую асветніцу і рэлігійную дзяячку

Юхо Я. **За вольнасць нашу і вашу**
Пра Тадэвуша Касцюшку (1746-1817), кіраўніка паўстання супраць маскоўскага панавання

Грыцкевіч В. **Адысея наваградскай лекаркі**
Пра Саламею Русецкую, знакамітую лекарку і падарожніцу XVIII стагоддзя

Працька Т. **Эксперыментатар з Беластоцкай гімназіі**
Пра Караля Чаховіча (1832-1902), таленавітага вучонага-фізіка

Казбярук У. **Светлай волі зычны звон**
Пра Алеся Гаруна (1887-1920), выдатнага паэта, змагара за незалежнасць Беларусі

Тарасаў С. **Чарадзей сёмага веку Траяна**
Пра Усяслава Чарадзея (1044-1101), аднаго з найславуцейшых полацкіх князёў

Гусак А. **Практычная механіка і "Мёртвыя душы"**
Пра Мікалая Ястрэбскага (1808-1874), вучонага-інжынера, таленавітага літаратара

Саверчанка І. **Канцлер Вялікага Княства**
Пра Лева Сапегу (1557-1633), славутага палітычнага дзеяча, рэдактара Статута 1588 года

Бельскі А., Ткачоў М. **Вялікае мастацтва артылерыі**
Пра Казіміра Семяновіча (~1600-1651), вынаходніка шматступеневай ракеты

Сагановіч Г. **Айчыну сваю баронячы**
Пра Кастуся Астрожскага (1460-1530), славутага гетмана

Арлоў У. **Прысуд выканаў невядомы**
Пра Ігната Грынявіцкага (1856-1881), рэвалюцыянера-народавольца

Каханоўскі Г., Каханоўскі А. **Руплівец нашай старасветчыны**
Пра Яўстаха Тышкевіча (1814-1873), заснавальніка беларускага краязнаўства

Дабравольскі В. **Да ісціны — найпрасцейшым шляхам**
Пра Васіля Ермакова (1845-1922), таленавітага вучонага-матэматыка

Гапоненка В. **У пошуках гармоніі Свету**

www.kamunikat.org

Пра Івана Яркоўскага (1844-1902), таленавітага вучонага-фізіка
Юхо Я., Емяльянчык У. "**Нарадзіўся я ліцьвінам...**"
Перапрацаванае і дапоўненае выданне пра Андрэя Тадэвуша Касцюшку
Процька Т. **Даследчык таямніцаў святла**
Пра Аляксандра Садоўскага (1859-1923), таленавітага вучонага-фізіка
Саверчанка І. **Апостал яднання і веры**
Пра Язэпа Руцкага (1574-1637), выдатнага пісьменніка, педагога і рэлігійнага дзеяча
Янушкевіч Я. **Неадменны сакратар Адраджэння**
Пра Вацлава Ластоўскага (1883-1938), выдатнага палітычнага і культурнага дзеяча
Ярмоленка В. **За даляглядам Айкумены**
Пра Івана Чэрскага (1845-1892), славутага географа і падарожніка
Гапоненка В., Кіштымаў А, **Уладар гранічнага холаду**
Пра Жыгімонта Урублеўскага (1845-1888), таленавітага вучонага-фізіка
Процька Т. **Пакутнік за веру і Бацькаўшчыну**
Пра Мітрапаліта Мельхісэдэка (1876-1931), прыхільніка незалежнасці нашае праваслаўнае царквы
Чарняўскі М. **Правадыр крылатых вершнікаў**
Пра Яна Кароля Хадкевіча (1560-1621), славутага гетмана

www.kamunikat.org

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год